Ніва

БЕЛАРУСКІ ТЫДНЁВІК

№ 34 (913) ГОД XVIII БЕЛАСТОК 26 ЖНІЎНЯ 1973 г. ЦАНА 60 гр.

У дажынкавы вянок

Ад Дуброўшчыны

ГАВОРЫЦЬ НАМЕСНІК СТАРШЫНІ ПРЭЗІДЫУМА ПРН У ДУБРОВЕ БЕЛАСТОЦКАЙ, ІНЖЫНЕР АЛЯКСАНДР САНІК

Дуброўскі павет мае выключна сельскагаспадарчы характар. Дык сяляне Дуброўшчыны ў гэты сімвалічны дажынкавы вянок стараюцца ахвяраваць ад сябе як найбольш тон дароднага збожжа, высокаякаснага мяса і тлустага малака.

Гаспадарыць на дуброўшчыне нялёгка. Клімат у нас суровы, паўночны. Краявід пераважна ўзгоркаваты, поле запоўнена каменнямі рознай велічыні. Для вока, гэта выглядае маляўніча, але трактарныя плугі, снопавязалкі і іншыя сельскагаспадарчыя прылады на кожным кроку падвяргаюцца тут небяспецы, бо хопіць зачапіць лемяхом за каменны валун, прыкрыты зямлёй, і ўжо — аварыя.

Таму адной з пільнейшых задач для нашага павету лічым мы ачыстку зямельных угоддзяў ад камення. Тады ў шырэйшым маштабе зможам прымяняць сучасную сельскагаспадарчую тэхніку.

Не хацеў бы, каб чытачы „Нівы“ зразумелі, што зараз мы прытрымоўваемся толькі традыцыйных метадаў земляробства. На палях Дуброўскага павету ўжо цяпер працуе 250 гурткоўскіх і 360 прыватных трактараў, а многія дзесяткі гаспадароў чакаюць у чарзе на пакупку гэтых стальных коней і спадарожных ім прылад. На жаль, трактараў няма ўдосталь, усім ахвотным іх не хапае. Адносіцца гэта не толькі да сялян Дуброўскага павету. Дык няма што дарэмна наракаць, а лепш гаварыць пра тое, што ёсць.

Ёсць, напрыклад, сапраўднае зацікаўленне апрацоўкай зямлі і наглядаецца штодзённае змаганне за ўсё вышэйшы ўраджай. 20,7 цэнтнера з кожнага гектара — гэта сярэдні мінулагодні ўраджай чатырох асноўных збожжавых культур, а ў гэтым годзе будзе вышэйшы. Такая ж справа ў прадуцэнтаў бульбы. У мінулым го-

Працяг на стар. 4




Павятовы цэнтр Дуброўшчыны з'яўляецца найлепшым сімвалам перамен, якія ў гэтым раёне нашай краіны здзейсніліся на працягу кароткага часу. Вёска Дуброва сталася даволі прыгожым гарадком.

Людзі добрай работы

ЮЛЬЯН ПАПЛАЎСКІ

Добрым гаспадаром у сваёй акрузе лічыцца Юльян Паплаўскі з вёскі Грыбаўцы Беластоцкага павету. Вядзе ён даволі вялікую гаспадарку. Мае больш 15 гектараў зямельных угоддзяў пятага і шостага класа. Са збожжавых культур найлепш удаюцца ў яго ячмень (24 цэнтнеры з 1 га), а таксама жыта і авёс (па 18 цэнтнераў з 1 га). Бульбы збірае ў сярэднім 200 цэнтнераў з гектара. Юльян Паплаўскі вёў доследныя палеткі з жытам і ячменем. Таму і вырошчвае ён зараз высокаплённыя сарты гэтага збожжа. Дзяржаве прадае ён больш 1100 кілаграмаў збожжа і каля 3.000 кілаграмаў бульбы. Гадуе найбольш кароў і свіней. У мінулым годзе прадаў на пункце скупкі пяць штук свіней і дзве каровы. Сёлета прадасць хатняй жывёлы яшчэ больш. Перадавы грыбавецкі гаспадар мае новыя сельскагаспадарчыя будынкі, між іншым, абору і клуню. Калі будуць меліяраваны лугі і сенажаці над ракой Грыбаўкай, пачне ён гадаваць больш кароў.



Юльян Паплаўскі ўжо цяпер глядзіць у будучыню. Намераны ён купіць сабе трактар і механізаваць абору.

Як вядома, каб добра гаспадарыць, неабходна добрая сельскагаспадарчая падрыхтоўка. Юльян Паплаўскі ахвотна ходзіць на курсы, якія вядуць аграномы і іншыя работнікі сельскай гаспадаркі. Пастаянна чытае сельскагаспадарчую прэсу. Працу ў полі стараецца механізаваць. Карыстаецца сельскагаспадарчымі машынамі МБМ ў Гарадку.

Два яго сыны таксама пайшлі слядамі бацькі. Адзін з іх сёлета закончыў вучобу ў Засаднічай школе механізацыі сельскай гаспадаркі ў Міхалове і намеран застацца на гаспадарцы. Другі пачаў прафесіянальную працу пасля заканчэння вучобы ў Тэхнікуме воднай меліярацыі ў Беластоку.

Юльян Паплаўскі — гэта таксама грамадскі дзеяч. Выбіралі яго солтысам, сакратаром мясцовай пярвічнай партарганізацыі і радным. Зараз з'яўляецца грамадскім апекуном і старшынёю мясцовай воднай суполкі.

Тэкст і фота **Я. Цялушэцкага**

ПРАЗ ТЫДЗЕНЬ У „НІВЕ“

Інтэрв'ю з старшынёй Прэзідыума Ваяводскай рады нарадовай у Беластоку ● На Белявіцкіх хутарах ● Новыя творы белавежцаў ● Знаёмствы ● Сустрэчы з землякамі (Др інж. Мікалай Назарук) ● Ніна і Васіль Прызовічы ● Ой, дажынайся, загонцу... ● Калгас „Перамога“ ● Весткі з Грэдалёў, Плёскаў, Белавежы, Бельска, Ласінкі і Валілаў ● Папулярная песня „Te opolskie dziouchy“

XXX-годдзе людовага войска польскага

НАШЫ АРЛЫ

Над горадам амаль без упынку раздаецца маланкавы грукат. Гэта сучасныя, рэактыўныя самалёты на звышгукавай хуткасці адпраўляюцца ў чарговы вучэбны палёт.

Жыхары горада ўжо прывыклі да гэтага. Дзеці гуляюць на панадворках. Старэйшыя афармляюць свае жыццёвыя справы і ніхто нават не звяртае ўвагі на тое, што дзеецца пад ясным, летнім небам, на фоне якога пралятаюць сярэбраныя стрэлы.

Толькі я — чужы ў гэтым горадзе — не магу абыякава прапусціць аніводнага пралёту стальных арлоў.

Тут, у гэтым горадзе, знаходзіцца асноўная кузня кадраў для польскай вайсковай авіяцыі — Вышэйшая афіцэрская авіяцыйная школа імя Янкі Красіцкага (ВОСЛь).

Адным з адказных работнікаў яе навукова-выхаваўчай і адміністрацыйнай кадры з'яўляецца наш зямляк з Бельска, маёр, *пілот* **Ежы Базылюк** — сын вядомага на Беласточчыне рэвалюцыйнага дзеяча.

Маёр Ежы Базылюк — высокі, прыгожы, цёмнавалосы мужчына. Сілуэт тыповага элегантнага афіцэра, за якім азіраюцца дзяўчаты.

Яго сям'я — жонка Яніна і двое дзяцей: 12-гадовая Малгося і 3-гадовая Агнешка — жыве скромна. Займаюць яны два невялікія пакоі з кухняй у нядаўна пабудаваным тыповым, „блёку“.

Пані Яніна частуе нас кавай і тады пытаю нашага земляка пра яго шлях.

— Было мне амаль 20 гадоў, — расказвае маёр Ежы Базылюк. — Працаваў я слёсарам у Бельскай рашарні, але гэтая праца мяне не здавальняла. Колькі раз нейкі самалёт завітаў над нашым Бельскам, заўсёды ўзнікала думка: а каб так мне... Аднаму майму сябру Рышарду Пяткевічу давялося праходзіць вайсковую службу ў атрадах авіяцыі. Вярнуўшыся з войска, ён наладзіў у Бельску курс планерызму. Пасля гэтага курсу я прыняў цвёрдае рашэнне, што буду лётчыкам. На дабавак Саюз польскай моладзі заклікаў тады сыноў рабочых і сялян паступаць у авіяцыю. І як бачыце, стаў лётчыкам.

— Як праходзіла ваша служба ў польскай ваеннай авіяцыі?

— Звычайна, як у войску, куды пасլалі, там служыў. Лётаў на усіх тыпах авіяцыйных машын, якія толькі знаходзіліся на ўзбраенні нашага людовага войска. Зведаў амаль усю Польшчу.

— А над Бельскам давялося вам хаця б раз кіўнуць стальным крылом?

— Адзін раз прабаваў, бо пралятаў недалёка, але радыёлакатары мяне завярнулі. Паднебны прастор шырокі, але лётчыкаў абавязваюць строгія правілы паводзін. Толькі ўласным аўтамабілем можаш ехаць куды захочаш. З роднай




Маёр Е. Базылюк.

Беласточчынай утрымоўваю я кантакты, калі маю водпуск. А цяпер ужо шмат гадоў жыву ў гэтым вось горадзе. Здароўе не дазваляе мне ўзнімацца ў паветра на навейшых самалётах, дык у іншы спосаб прыкладаю сваю руку да выхавання маладых кадраў. Жыву, як тысячы іншых грамадзян нашай краіны. І няма што пра мяне пісаць. Вы лепш напішыце аб нашай школе, якая мае багатыя традыцыі, існуе ад 1928 года.

Вышэйшая афіцэрская авіяцыйная школа раскінулася на вялікім прасторы. Гэта своеасаблівы горад у горадзе. Маёр Базылюк і яго сябры па працы паказваюць мне гэтае іх каралеўства. Аграмадныя дыдактычныя залы рознага прызначэння. А, на кожным кроку навейшая дапаможная, пераважна элек-

Працяг на стар. 4

Падзеі ◊ Здарэнні ◊ Факты ◊ Каментарыі ◊ Весткі

 СВЕТ  БССР  ПОЛЬШЧА  ВАЯВОДСТВА

У АТМАСФЕРЫ ЛЕГАЛЬНАСЦІ

Больш чым 500 дэлегатаў, выбраных на рэгіянальных партыйных канферэнцыях Аргенціны прынялі ўдзел у XIV з'ездзе Камуністычнай партыі краіны. З'езд склікана ў днях 20—24 жніўня.

XIV з'езд — першы, які адбыўся ў легальных умовах. Апошнія 27 гадоў аргенцінскім камуністам даводзілася працаваць у падполлі, пад пагрозай жорсткіх палітычных рэпрэсій. Адмена законаў, якія забаранялі дзейнасць кампартыі, была выпраўлена ўрадам Эктара Кампоры адразу ж пасля яго прыходу да ўлады 25 мая гэтага года.

СІТУАЦЫЯ Ў ЧЫЛІ

Выступаючы па радыё і тэлевізіі, прэзідэнт Чылі Сальвадар Альендэ падрабязна прааналізаваў незаконны і падрыўны характар забастоўкі уладальнікаў грузавікоў і яе цяжкія вынікі для нацыянальнай эканомікі. Да 40 працэнтаў прадпрыемстваў, заявіў С. Альендэ, працуе на чвэрць магутнасці з-за цяжкасцей з падвозам сыравіны і паліва. Сярод гэтых прадпрыемстваў — буйнейшы цукровы завод краіны „Іанса", заводы малочнай прамысловасці. З-за несвоечасовай дастаўкі насення і ўгнаенняў пад пагрозай веснавая сяўба, сказаў прэзідэнт. Прападае прадукцыя рыбнай гаспадаркі, вялікія страты нясе галоўная галіна эканомікі рэспублікі — меднарудная прамысловасць.

Забастоўка суправаджаецца разгулам тэрарызму і насілля, заявіў прэзідэнт. У выніку справакаваных у краіне правымі сіламі інцыдэнтаў ёсць чалавечыя ахвяры. „Гэта фашызм у дзеянні", — сказаў С. Альендэ.

З ДОБРАСУСЕДСКІМ ВІЗІТАМ

Упершыню пасля 1956 года, калі былі нармалізаваны японска-савецкія дыпламатычныя адносіны кіраўнік японскага ўрада К. Танака наведае СССР. У Маскве правядзе ён перагаворы з савецкімі кіраўнікамі па шырокаму колу пытанняў, якія закранаюць адносіны паміж дзвюма краінамі. Ужо сам факт паездкі японскага прэм'ер-міністра ў Маскву, сведчыць аб тым, што адносіны паміж дзвюма суседнімі краінамі дасягнулі такой стадыі, калі патрабуюцца прамыя перагаворы на вышэйшым узроўні, каб намецiць шляхі далейшага развіцця дзелавых і палітычных сувязей паміж імі.

СПРАВЫ МЕЛІЯРАЦЫІ

У Савецкім Саюзе ажыццяўляецца шырокая праграма меліярацыі. За час, што мінуў пасля майскага (1966 г.) Пленумам ЦК, уведзена ў эксплуатацыю 7,1 мільёна гектараў новых арашаемых і асушаных зямель, магчымасці воднагаспадарчых арганізацый узраслі ў 2,5 раза, створаны буйныя прадпрыемствы будаўнічай індустрыі, у два разы павялічыўся парк меліярацыйных машын. У воднагаспадарчых арганізацыях цяпер працуюць звыш мільёна рабочых і спецыялістаў.

ЭКСПАРТ „ШКОДЫ"

У мінулым годзе Чэхаславакія прадала 53.6000 аўтамабіляў „Шкода" у сацыялістычныя краіны і 34.300 — у капіталістычныя. Найбольш закупіла ГДР (15 тыс.) і Югаславія (13 тыс.). 8,3 тыс. купіла Вялікабрытанія, 6,7 тыс. — Францыя, 4,3 — ФРГ. (ак)

ПЕРАДАВІКІ ЎБОРКІ

На ўсю Беларусь праславіліся імёны такіх майстроў жніўнага фронту як: Л. Сакоўскі, з калгаса „Кастрычнік" у Хойніцкім раёне, Г. Катляроў з калгаса „Кастрычнік" у Веткаўскім раёне, М. Краўчук з калгаса „Кастрычнік", у Клецкім раёне, І. Карнеевіч з саўгаса „Свабода" у Салігорскім раёне, В. Васілюк з калгаса „Запаветы Ільіча", у Кобрынскім раёне. Многія з перадавікоў уборкі, закончыўшы жніво ў сваіх гаспадарках, пераехалі на нівы суседзяў.

ПОСПЕХ ХЛЕБАРОБАЎ

Газета „Звязда" падае, што ў саўгасе „Любанскі" з кожнага гектара атрымана больш чым 40 цэнтнераў збожжа. Жніво завершылі там за 10 дзён.

ПРА АРТЫСТАЎ КІНО

Паявілася ў выдавецтве „Навука і тэхніка" цікавая кніжка А. Красінская „Беларускія акцёры ў кіно". Аўтар гэтай працы даказвае, што ўдзел беларускіх артыстаў у кіно пачаўся амаль з таго часу, як з'явіліся першыя нацыянальныя фільмы. Кніжка багата ілюстравана здымкамі.

СЯБРОЎСТВА ПРАДАЎЖАЕЦЦА

Між лодзінскім літаратурным асяроддзем і беларускімі пісьменнікамі завязалася трывалая і дзелавая дружба, пра якую не аднойчы мы ужо пісалі. Нядаўна ў гасцях у беларускіх майстроў мастацкага слова зноў пабывалі лодзінскія пісьменнікі: Вeслаў Яждыньскі, Тадэўш Хрусцілеўскі, Станіслаў Пагачэўскі і Анджэй Занецкі. Яны наведалі радзіму Янкі Купалы — Вязынку, Курган Славы і Хатынь, сустракаліся з многімі беларускімі пісьменнікамі.

НАСТАЎНІКІ З БЕЛАСТОЧЧЫНЫ Ў БССР

Як штогод шматлікая група настаўнікаў беларускай мовы са школ Беластоцкага ваяводства пабывала на месячным курсе ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя М. Горкага. У клубе Саюза пісьменнікаў БССР адбылася сустрэча нашых настаўнікаў з беларускімі пісьменнікамі. Аб сваёй творчай працы расказвалі Аляксей Кулакоўскі, Янка Брыль, Мікола Аўрамчык, Аркадзь Марціновіч, Анатоль Вярцінскі, Генадзь Бураўкін, Мікола Катур, Алесь Ставер.

„ПАЎЛІНКА" У МАГІЛЁЎСКІМ ТЭАТРЫ

Вясёлая камедыя Я. Купалы „Паўлінка" ўсё яшчэ астаецца на афішах беларускіх тэатраў. У Магілёўскім абласным тэатры гэты спектакль глядзела ўжо больш за 50 тыс. гледачоў. „Паўлінку" у Магілёве паставіў рэжысёр У. Л. Караткевіч, а галоўную ролю выконвае тут Н. Караткевіч. Юбілейны паказ „Паўлінкі" — з нагоды 50-ці тысячнага гледача — адбыўся на сцэне клуба калгаса „Ударнік" Мсціслаўскага раёна.

ВУЧНІ-РАЗВЕДЧЫКІ

Цікавую форму правядзення канікулаў прыдумалі для сваіх вучняў настаўнікі многіх сярэдніх школ Мінска. Вучні 121 школы рашылі адшукаць звесткі і дакументы аб партызанскай брыгадзе „Буравеснік" і таму вандравалі яе баявым шляхам. Школьнікі з 93 сярэдняй школы шукалі матэрыялаў пра героя Савецкага Саюза — Бумажкова. (вр)

ПАСЯДЖЭННЕ РАДЫ МІНІСТРАЎ

15 жніўня г.г. адбылося пасяджэнне Рады Міністраў з удзелам старшыняў прэзідыумаў ВРН, на якім абмяркоўваліся прынцыпы праекту плана грамадскага і гаспадарчага развіцця краіны ў гадах 1974—1975. Перад нашым грамадствам паўстаюць чатыры найважнейшыя заданні: далейшае ўмацаванне грашоварынкавай раўнавагі, удасканаленне дзеяння на разгорнутым інвестыцыйным фронце, палягшэнне гаспадаравання людскімі рэсурсамі, сыравінай і матэрыяламі, развіццё замежнага гандлю, асабліва экспарту. Прэм'ер П. Ярашэвіч падкрэсліў, што напрамак дзейнасці вызначаны ў прынцыпах праекту плана грамадскага і гаспадарчага развіцця нашай краіны ў бліжэйшыя гады, поўнасцю адпавядае аб'ектыўным узрастаючым грамадскім запатрабаванням, гэтая праграма не з'яўляецца лёгкай, неабходна разважлівае выкарыстанне ўсіх рэзерваў.

НАШЫЯ ДАРОГІ

Не належаць да найгоршых ў Еўропе, але вымагаюць няспынных будовы новых ліній, рамонту і мадэрнізацыі старых. У гэтым годзе праведзен рамонт 1400 км дарог з асфальтаванай паверхняй, да канца года адрамантуецца яшчэ 2700 км. На палягшэнне дарожнай паверхні ў бягучым годзе пойдзе звыш 5 мільёнаў тон бітуму. Нашыя дарожнікі звяртаюць асаблівую ўвагу на дастасаванне дарог да павялічанага руху і праезду цяжкіх аўтамабіляў (з ціскам 10 тон на вось). У 1970 годзе ў нашай краіне было 12 тысяч км такіх дарог, а ў 1975 годзе будзе іх звыш 20 тысяч км.

ШТО ПАСЕЕШ, ТОЕ І ЗБЯРЭШ

Яшчэ поўнасцю не закончылася жніво, а ўжо ў збожжавых складах знаходзіцца звыш 150 тысяч тон высокакваліфікаванага насення на асення пасевы. У бягучым годзе нашая сельская гаспадарка атрымае 300 тысяч тон насення на абнаўленне. Значна больш, чым у мінулым, будзе пшаніцы „Грана", „Каўказ" і „Аўрора", а таксама жыта „Дань						коўскае залатое". Упершыню ў агульным абмене знойдзецца жыта „Панцэрнае", якое з'яўляецца устойлівым на выляганне.

ТРАКТАРЫ ЎЗНАГАРОДАЙ ДЛЯ АШЧАДНЫХ

Звыш 95 тысяч ашчадных кніжак на агульную суму 845 мільёнаў злотых маюць нашыя сяляне на той форме ашчаднасці, якую ПКО прэм'юе выйгрышам трактара. Да гэтага часу ў выніку 4 розыгрышаў уладальнікі такіх кніжак атрымалі 244 трактары, у тым ліку ў жніўеньскім розыгрышы — 86 гэтых машын.

НЕ БУДЗЕ КАЛЕКАМ

У часе жніва ў нешчаслівым выпадку трактарысту С. Тарноўскаму амаль цалкам зніштала ногу, яна вісела на кавалачках скуры. У выніку трохгадзіннай аперацыі ў хірургічнай клініцы ў Пшэмыслі калектыў лекараў склаў косць, сшыў крованосныя сасуды, нервы і мускулы. Стан хворага паказвае, што аперацыя поўнасцю ўдалася. (мг)

ЖНІВО ЗАКОНЧАНА

На пераломе жніўня з палёў Беласточчыны зніклі апошнія снапы збожжа. Першым аб заканчэнні жніва паведаміў Кольненскі павет. За ім — Сувальскі, Лапскі і Гайнаўскі. 16 жніўня ў Кныщыне адбылася ўрачыстасць, на якой працаўнікі беластоцкіх ПГР-аў уручылі І сакратару ВК ПАРП З. Куроўскаму рапарт аб заканчэнні жніва ў дзяржаўных гаспадарках. Аб заканчэнні збору ўраджаю збожжа заявілі таксама прадукцыйныя спулдзельні.

У сувязі з заканчэннем жніва Прэзідыум ВРН звярнуўся да сялян з заклікам, у якім дзякуе сялянам за спраўны збор ураджаю і прыпамінае аб добрым забеспячэнні сабранага збожжа і выконванню работ, якія патрэбны для ўраджаю будучага года.

У БАНК „30 МІЛЬЯРДАЎ"

З кожным месяцам узрастае вартасць дадатковай прадукцыі прамысловых прадпрыемстваў Беласточчыны, якія адгукнуліся на заклік Сакратарыята ЦК ПАРП і Прэзідыума ўрада. Як падае Ваяводскае статыстычнае ўпраўленне, да гэтага часу прадпрыемствы далі звыш плана вырабаў на агульную суму 380 мільёнаў злотых. Некаторыя прадпрыемствы ўжо выканалі або заканчваюць выкананне ўзятых на сябе абавязацельстваў. Напрыклад, прадпрыемства па вырабу жэльбетонных элементаў у Элку, тартакі Акруговага прадпрыемства драўнінай прамысловасці, фабрыка стружкавых пліт у Сувалках, чыгункава-рамонтнае прадпрыемства ў Лапах, фабрыка сельскагаспадарчых машын у Чорнай Беластоцкай, гайнаўскія прадпрыемствы драўніннай прамысловасці і іншыя.

СУСТРЭЧА З І САКРАТАРОМ

Наймалодшыя студэнты беластоцкіх вышэйшых школ прабываюць цяпер у Беластоку на студэнцкай рабочай практыцы. Студэнты працуюць у пляцоўках службы здароўя, на будовах, удзельнічаюць ва ўпарадкаванні горада да цэнтральных дажынак. 13 жніўня з групай гэтых студэнтаў сустрэўся І сакратар ВК ПАРП З. Куроўскі. Ён расказаў студэнтам аб галоўных напрамках развіцця Беласточчыны, пазнаёміў з планамі выкарыстоўвання кіраўнічых кадраў у гаспадарцы ваяводства. Пасля адбылася вельмі цікавая дыскусія.

У верасні прыязджае ў Беласток наступная 400-асабовая група студэнтаў.

НА БЕЛАСТОЧЧЫНЕ

Беластоцкая вёска Клюкова (Высокамазавецкі павет) будзе месцам цэнтральных урачыстасцей пачатку новага навучальнага года. На ўрачыстасць прыедуць прадстаўнікі ўлад на чале з міністрам асветы і выхавання Е. Кубэрскім. У праграме ўрачыстасці — адкрыццё ў Клюкове новай зборнай гміннай школы, для якой пабудаваны новы будынак, і прысваенне школе імя Камісіі народнай адукацыі. Вызначэнне беластоцкай мясцовасці на цэнтральную ўрачыстасць з'яўляецца выразам падзякі за працу і дасягненні беластоцкіх настаўнікаў.

ВЫСТАЎКІ

Ад 18 жніўня ў салоне Саюза польскіх артыстаў-мастакоў адкрыта выстаўка жывапісу І. Кшэвінскай, а ў будынку Музея рэвалюцыйнага руху па вул. Кілінскага 6 можна яшчэ паглядзець выстаўку пасляпленерных карцін „Пачкаў — 72". (яч)



Niedziela — 26.VIII

7.25 Program dnia. 7.30 TV Technikum Rolnicze — Siewy jesienne. 8.10 Przypominamy, radzimy. 8.30 Nowoczesność w domu i zagrodzie. 9.00 „Osobliwi mieszkańcy Parku Narodowego" — dokum. film angielski („Świat, który nie może zaginąć"). 9.25 Antena. 9.40 „Ostatnie chwile pokoju" (W starym kinie). 10.40 Od Alaski do Rio Grande („180.000 km przygód") 11.10 Niedzielny koncert promenadowy z Drezna. 12.10 Dziennik. 12.25 Przemiany. 12.55 Teatrzyk dla przedszkolaków. 13.40 Piórkiem i węglem. 14.10 „Święto młodości" — Lesko 73 — program rozrywkowy. 14.40 Losowanie Toto-Lotka. 14.55 Interstudio. 15.35 Estrada Poetycka — Poezja Polska, K. I. Gałczyński „Bal u Salomona". 16.05 Radar. 16.15 Mitting Wyścigów Konnych krajów socjalistycznych. 17.30 „Wikingowie" — fab. film USA. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 XIII Międzynarodowy Festiwal Piosenki w Sopocie — Koncert Laureatów. 22.35 Magazyn sportowy.

Poniedziałek — 27.VIII

16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Fotografia" — film prod. węgierskiej. 17.00 Echo stadionu. 17.30 Walce Jana Straussa, śpiewa Poznański Chór Chłopięcy. 17.55 TV Kurier Lubelski. 18.10 Oferty. 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 Magazyn Postępu Technicznego. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 Letni Przegląd Teatru TV: Jarosław Iwaszkiewicz — „Maskarada". 21.55 „Po wachcie" — rep. filmowy („Profile kultury"). 22.25 Dziennik.

Wtorek — 28.VIII

10.00 „Czerwone wino" — odc. III. fab. filmu TV Czechosłowackiej. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Sceny fantastyczne" — film baletowy TV Bułgarskiej. 17.05 „Raport z półwyspu Hel" — reportaż („Morskie spotkania"). 17.35 TV Kurier Mazowiecki. 17.55 Dla młodych widzów: „Antek" — film TVP. 18.40 „Rodzina". 19.10 Przypominamy, radzimy. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 „Czerwone wino" — odc. III fab. filmu TV Czechosłowackiej. 21.35 „Pryzmat". 22.05 Dziennik i wiadomości sportowe. 22.30 Studio przebojów — program rozrywkowy TV NRD.

Środa — 29.VIII

10.00 „Mats Peter" — fab. film szwedzki. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Informacje — Towary — Propozycje. 17.00 Sprawozdanie z mistrzostw świata w kolarstwie. 18.00 Program filmowy rozrywkowy. 18.30 TV Kurier Warszawski. 18.50 „Orbita". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 Film z serii: „Bonanza". 21.05 „Świat i Polska". 21.45 Muzyka w dawnym Gdańsku. 22.30 Dziennik. 22.45 Wiadomości sportowe oraz Kronika mistrzostw świata w kolarstwie.

Czwartek — 30.VIII

10.00 Film z serii „Bonanza". 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Gramy o telewizor. 17.05 PKF. 17.15 Spacerkiem po kinach. 17.40 TV Kurier Mazowiecki. 18.00 Telewizja Młodych. 18.45 Sylwetki X Muzy — Andrzej Kopiczyński. 18.10 Przypominamy, radzimy. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 „Wiem, że jesteś mordercą" — fab. film czechosłowacki. 21.50 Bez togi. 22.30 „Ekspres" — nr 33. 23.00 Dziennik. 23.15 Wiadomości sportowe i Kronika Mistrzostw Świata w kolarstwie.

Piątek — 31.VIII

10.00 „Wiem, że jesteś mordercą" — fab. film czechosłowacki. 15.55 Program dnia. 16.00 Nie tylko dla pań. 16.30 Dziennik. 16.40 Teatr Młodego Widza — Roman Brandstaetter: „Kopernik". 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 „Kamera i karabin" — film dokum. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.15 Śpiewa Liliana Urbańska. 20.45 Panorama. 21.25 Teatr TV: Jerzy Broszkiewicz — „Skandal w Hellbergu". 22.45 Dziennik i wiadomości sportowe.

Sobota — 1.IX

10.00 „Jeszcze słychać śpiew i rżenie koni" — fab. film polski. 15.45 Program dnia. 15.50 Program I proponuje. 16.10 Redakcja Szkolna zapowiada... Inauguracyjne przemówienie Ministra Oświaty i Wychowania. 16.30 Dziennik. 16.45 Sprawozdanie z Mistrzostw Świata w kolarstwie (wyścig drużynowy). 18.40 „Godzina Orfeusza". 19.20 Dobranoc. 19.30 Monitor. 20.15 „Z bitewnych pól" — występ Centralnego Zespołu Artystycznego Wojska Polskiego. 21.35 Dziennik i wiadomości sportowe. 22.00 „Jeszcze słychać śpiew i rżenie koni" — fab. film polski.



Piątek, 24 sierpnia

8.10 Film seryjny. 9.50 Szkoła szachowa. 10.20 Spotkania muzyczne. 11.00 Wioślarstwo. Mistrzostwa Europy. Kobiety. 13.00 Program dnia. 13.05 Film seryjny. 15.00 Świat socjalizmu. 15.30 Uniwersjada. 17.50 Film seryjny. 19.00 Czas. 20.00 Balet. 20.20 Uniwersjada. 21.45 Panorama nowin.

Sobota, 25 sierpnia

7.00 Program dnia. 8.00 W eterze „Młodość". 8.30 Wioślarstwo. Mistrzostwa Europy. Kobiety. 9.15 Człowiek. Ziemia. Wszechświat. 9.45 Filmy animowane. 10.30 Przegląd międzynarodowy. 10.45 Koncert dla uczestników Uniwersjady. 12.30 Film fab. 13.50 Białe i czarne. 14.50 Koncert z Sali Kolumnowej. 15.55 Uroczyste zamknięcie Uniwersjady i mecz piłki nożnej: „Spartak" (Moskwa) — „Dynamo" (Kijów). 19.00 Czas. 20.40 Uniwersjada.

Niedziela, 26 sierpnia

7.00 Program dnia. 7.30 W moskiewskim ZOO. 9.15 Kiosk muzyczny. 10.40 Spektakl teatru lalek. 11.30 Filmy animowane. 13.45 Klub filmowy. 14.30 Program muzyczny. 15.00 Hokej. Finał turnieju międzynarodowego. Transmisja z Leningradu. 17.15 Koncert. 17.35 Film dokument. 19.00 Czas. 19.30 Koncert życzeń. 20.30 Wioślarstwo. Mistrzostwa Europy. Kobiety.

З песняй у Сопат

У разгар лета дайшлі да нас чуткі: сапоцкая эстрада арганізуе фестываль песні нацыянальных меншасцей. Неўзабаве прыйшло і канкрэтнае запрашэнне на 50 асабовы калектыў.

Гонар прадстаўляць БГКТ у Сопат выпаў на долю самадзейнікаў з Гарадка, Плёсак і Дубяжына. Яны павінны былі гарантаваць спаяную цэласць. Часу на падрыхтоўку не засталося: сенакос, жніво. Разлік на вопыт і кемлівасць выканаўцаў і іх кіраўнікоў. Таму з мешанымі настроямі адправіліся мы 1 жніўня ў далёкую дарогу. Цешыла магчымасць паказаць свае песні ў славутай польскай сталіцы песенных фестываляў, непакоіла пытанне: ці нашы здадуць гэты важны экзамен?

Ужо першыя кіламетры прадказвалі найгоршае: аўтакар гудзеў ад песняў і заклікі берагчы галасы на Сопат не далі пажаданых вынікаў. Спявалі ўсю дарогу. Што ж, эмоцыі перамаглі развагу. Ехалі ў асноўным маладыя людзі, якіх цешыла ўжо сама паездка.

Трывожныя ноткі паявіліся на другі дзень, пасля канцэрту ўкраінцаў. Гэта быў зладжаны, на высокім ўзроўні калектыў. Але верх узяла зноў тая ж маладосць: не лёгкая на ўступкі. І калі 3 жніўня ў 20 гадзін пачаўся беларускі канцэрт, я не прыкмеціў у нашых выканаўцаў згубнага хвалявання. Малайчыны! Як бы выгадаваліся на гэтай сцэне. Асабліва гэта датычыць надзейнага ва ўсіх выпадках Гарадка. Гарадоцкія „чараўніцы" ўмеюць стварыць на сцэне адпаведны настрой, прывараджыць публіку. Дасканала гэту ролю выконвае, напрыклад, лірычная песня „Не шукай ты мяне" (больш такіх песень!). Апрача гэтай, Гарадок выканаў „Дзве падружкі", „Гарадоцкія частушкі", „Біла жонка мужыка", „Вечарынку", „Ой, пайду я па-над лугам", „Замуж, пайсці трэба знаць" і „А ў нядзелю...".

Не згубіліся на сапоцкай сцэне таксама маладзенькія дзяўчаткі з Плёскаў. Іх гвоздзем праграмы была дасканалая „Вярба". Затым спявалі яны „Ой, пайду я, выйду", „Цячэ за гаем рэчка", „Заходзіт слонце", „Сіраціночку" і частушкі пра БГКТ. Хочацца параіць гэтаму, маладому, хоць і вядомаму ўжо ў нас квартэту: спявайце больш песняў сваёй вёскі (нічога, што яны на дыялекце), у гэтым ваша сіла.

Адкрываў наш канцэрт калектыў з Дубяжына прывітальнай песняй „Добры дзень". Потым у яго выкананні пачулі мы „Жніўную", „Стаяла бяроза", „Ой, у полі вярба", „Па саду хадзіла", „Ой, маманька, вішня", „Ты чырвоная каліна", „Бабу Еўку", „Сабралася бедна голота", „Пасылала мяне мацi" і „Антон маладзенькі". Магчыма, не ўсё тут было дапрацавана і з некаторымі песнямі варта было яшчэ пачакаць, але такія, як „Стаяла бяроза", „Ой, у полі вярба", „Па саду хадзіла", „Ой, маманька, вішня", „Пасылала мяне мацi" і асабліва „Ты чырвоная каліна" зрабілі прыемнае ўражанне. У калектыве добрыя салісты Ірэна і Аляксандр Рамانюкі. Апошні бліснуў „Зоркай Венерай".



Група нашых ля славутай „Буры" ў Гдыні.

Паміж песнямі выступіла таксама танцавальная пара (Ольга Пыхнер і Янка Крупа) з „Крыжачком" і „Лявоніхай". Уся беларуская група на заканчэнне выканала развітальную „Бывайце здаровы".

Працягвалася наша праграма 70 мінут. Пасля перапынку выступіў сла-

(Працяг на стар. 4)



Настаўніца Ольга Галавачык з'яўляецца старшынёй рады клуба і адначасова кіраўніком мастацкага калектыва ў школе.



Зоф'я Асташэўская — сапраўдная гаспадыня клуба.



Арцём Свентахоўскі, абсальвент механічнага тэхнікума застаўся на гаспадарцы ля старэватых бацькоў. У сваёй вёсцы ад вясны, ад моманту вяртання з арміі. Адразу ўключаецца ў жыццё гуртка ЗСМВ і клуба.

Жывы клуб

У Тыневічах Малых што ў Гайнаўскім павеце няма ніякага дзяржаўнага будынку, дзе магло б цвісці культурнае жыццё. Няма і не было тут школы, не было і няма святліцы але...

Некалькі год таму назад маладыя людзі Зоф'я і Ян Асташэўскія пабудавалі новы дом. Частку яго адступілі на памяшканне для клуба „Рух". З. Асташэўская стала гаспадаром клуба. Незадоўга ў клубе паявіліся адаптар, радыёпрыёмнік, тэлевізар. У хуткім часе клуб мае атрымаць магнетафон.

Гаспадыня клуба, якой дапамагае муж, навязала кантакт з гуртком ЗСМВ. 25 членаў Малатыневіцкага гуртка ЗСМВ хутка пераканаліся, што імення тут у клубе могуць весці сваю культурную і грамадска-палітычную дзейнасць. Цяпер у клубе адбываюцца ўрачыстасці і вечарыны з нагоды святаў і гадавін, тут адбываюцца сельскагаспадарчыя і маладзёжныя шкаленні. У клубе ў Малых Тыневічах адбываюцца гарцэрскія зборы, дзецям дэманструюцца дыяфільмы. Школьнікі з Вялікіх Тыневіч даюць часта мастацкія чаткі.

Але працуе таксама і дарослая моладзь. У мінулым годзе апрацавана сцэнку на беларускай мове, з якой выступалі не толькі ў Малых Тыневічах, але і ў навакольных вёсках. Калі мы наведалі клуб было лета і міма таго, клуб не пуставаў. Сюды прыходзяць моладзь і дарослыя, прыходзяць паглядзець тэлевізар, паслухаць радыё, арганізаваць танцавальную вечарыну, а нават пасядзець, прасачыць прэсу. А пасядзець тут таксама вельмі прыемна і ўтульна. На вокнах чысценькія занавескі, а на століках заўсёды свежыя кветкі. Ды і наогул у клубе чыста. На сценах эстэтычна выкананыя насценгазеты аб краіне і Беласточчыне. Кожны чацвер клуб наведвае аб'язное кіно з Нарвы.

Гурток ЗСМВ пад кіраўніцтвам Мікалая Свентахоўскага арганізаваў сабе спартыўную пляцоўку. Асаблівай папулярнасцю цешыцца валейбол і футбол. Члены гуртка рамантавалі таксама грамадскім чынам дарогу ад вёскі да аўтобуснага паўстанка.

Зразумела, не ўсё ўдаецца адразу. Напрыклад, у мінулым годзе намячалася сарганізаваць у клубе штосьці на ўзор кудзельніц. Запрашалі, але людзі ў Малых Тыневічах за мала адважныя, хіба, не прыйшлі. Гэта нічога, прыйдуць. Цешыць аднак тое, што ў Малых Тыневічах, дзякуючы ініцыятыве і самаадданасці некалькіх жыхароў, развіваецца культурнае жыццё чаго ім можа пазайздросціць не адна вёска.

Тэкст і фота **А. Карпюка**



Старэйшыя і малодшыя школьнікі — частыя госці і «гаспадары» клуба на працягу цэлага года.



МІНІЯЦЮРЫ ЯНОВІЧА НА ПОЛЬСКАЙ МОВЕ

На полках кніжных магазінаў паявілася новая кніжка Сакрата Яновіча, а яе загаловак — „Вялікі горад Беласток"*).

Кніжку выдала маладзёжнае выдавецтва „Іскры". Яновіч вядомы нашаму чытачу як пісьменнік, які піша па-беларуску. Змешчаныя ў новай кніжцы мініяцюры пераведзены на польскую мову паколькі Яновіч надалей піша на мове свайго дзяцінства, па-беларуску. Пераклад 57 твораў зрабілі Тадэўш Джугай, Ян Гушча, Мацей Юзэф Канановіч, Лешэк Кажушка, Ежы Літвінюк, Эдвард Рэдлінскі, Віктар Рудчык і Віктар Варашыльскі.

Цікавую, а мо і дыскусійную характарыстыку аўтара дае рэдактар кніжкі і падборшчык тэкстаў Е. Літвінюк ва ўступе. Гаворыць ён: „Яновіч — хаця на першы погляд можа гэта паказацца парадаксальным — з'яўляецца народным (людовым) паэтам. Паэтам, які піша прозай. Паэтам, таму што не знойдзеш у яго апісанняў для апісання, сказа, які б не хваляваў, не ўзрушаў. Народным (людовым) — паводле фармулы Брэхта — „Народнае, гэта не тое, што аб народзе (людзе), але тое, што датычыць народа. Яго ўяўленне канцэнтруецца вакол таго, што найважнейшае, выбраным дробязямназіраемага выпадку ці пачутага апавядання дае эпічныя памеры. Ударае свежасцю погляду".

Не месца тут распісвацца над творчасцю Яновіча. З нагоды выдання твораў нашага пісьменніка на польскай мове хацелася б адзначыць, што зроблена першы добры крок у галіне азнаямлення польскага чытача з творчасцю беларускіх пісьменнікаў у Польшчы, вырасшых на Беластоцкай зямлі і карыстаючыхся яе глебай у сваёй творчасці.

А. Карпюк

*) Sokrat Janowicz „Wielkie miasto Białystok", Iskry 1973, str. 180, zł. 10.

Што плёскаецца ў Валілаўскіх ставах

У Валілах — ПГР. Адзіны ПГР на ўсю Гарадоцкую гміну. Вось такі сабе звычайны. Нават з тых меншых. Уздоўж пэгээраўскай дарогі пэгээраўскі пастух два разы ў дзень ганяе стада пэгээраўскіх кароў. Пэгээраўскія трактары лепш ці горш аруць пэгээраўскія палі. З левага боку дарогі ў радзе не надта прыгожых, блізнячых пэгээраўскіх домікаў жывуць пэгээраўскія рабочыя.

Дзіва пачынаецца толькі тады, калі зірнеш направа. Блакіт, свежая зелень і недзе далёка-далёка на небасхіле лес. Павеяў вецярок, і ўвесь краявід замільгаў перад вачыма, пакрыўся рабаценнем. Гэта наморшчылася драбнюткай хвалькай гладкае дагэтуль абліччa шматлікіх сажалак. Абрамленыя трысняком, яны расплываюцца „вокамі", як тлушч на паверхні супу, аж некуды пад скрай земляной талеркі. Кіламетрамі цягнецца грэбля.

Ідзеш ды ідзеш. Сеў бы, здаецца, над стаўком, папляваў на чарвячка, закінуў вудачку, ды прыгаварваў ціхенька, як у той казцы: „Лавіся рыбка вялікая ды маленькая".

А вось і шмык! Не! Рыба дык тут ёсць. Камандуе ад-

(Працяг на стар. 5)

Пачатак на стар. 1

Ад Дуброўшчыны

дзе — 217 цэнтнераў з гектара, у гэтым спадзяемся не менш.

У сельскай гаспадарцы ўсё спалучаецца між сабой як паасобныя кольцы ланцуга. Калі расце раслінная прадукцыя, тады і жывёлагадоўля атрымоўвае спрыяльныя ўмовы для развіцця. У гэтым мы пераканаліся на практыцы. Апошні сельскагаспадарчы чэрвеньскі перапіс паказаў, што ў хлявах і аборах гаспадароў на Дуброўшчыне знаходзіцца ўсё больш і больш дамашняй жывёліны. Для прыкладу, колькасць свінней павялічылася на амаль 24 прац. у параўнанні да мінулага года. Зараз у пераліку на 100 га зямельных угоддзяў прыпадае ў нас блізка 110 штук свінней.

У апошніх гадах паглыбляецца на Дуброўшчыне высокатаварны характар сельскай гаспадаркі. Нашы хлебаробы ў мінулым гаспадарчым годзе прадалі звыш 10 тыс. тон збожжа, гэта амаль на 42 прац. больш чым у папярэднім перыядзе. На працягу 6 месяцаў гэтага года жывёлагадоўцы дасталі на скупачныя пункты на 30 прац. больш свінней і быдла чым у першым паўгоддзі 1972 года.

Гэтым чынам сяляне Дуброўскага павету па ўраджайнасці збожжа, па вырошчванню бульбы і ў свінагадоўлі шматзначна выперадзілі планаваныя намі паказальнікі, бо ўжо цяпер асягнулі яны ўзровень 1975 года.

Лічым мы гэта нашым асноўным падарункам у Дажынкавы вянок, бо ў такой, а не іншай паставе сялян Дуброўшчыны мы бачым праяўленне найбольш сучаснага духу і адначасова тут адчуваецца гэтая атмасфера творчай працы, якую ў апошніх гадах стварылі партыя і ўрад. Аджыла вера ў сэнс працы на зямлі. Рэдка дзе сустрэнеш ужо селяніна, які лічыў бы сябе пакрыўджаным лёсам толькі таму, што прыйшлося яму астацца на гаспадарцы. На весну гэтага года, калі было ўжо ведома, што Цэнтральныя дажынкі адбудуцца ў Беластоку, калі Цэнтральны Камітэт партыі звярнуўся да сялян з заклікам аб павышэнні прадукцыі — жыхары сельскагаспадарчай Дуброўшчыны адклікнуліся канкрэтнымі абавязацельствамі, аб выніках якіх я толькі што гаварыў.



Намеснік старшыні прэзідыума ПРН у Дуброве Беластоцкай, інжынер Аляксандр Санік.

Гэтыя псіхічныя перамены відавочны на кожным кроку. Лічым мы іх вельмі важным здабыткам народнай улады.

Маем у нашым павеце многа добрых і вельмі добрых гаспадароў. Для прыкладу назаву толькі тых, якія заваявалі сабе высокае прызнанне ўлад і свайго асяроддзя. Гэта перш за ўсё **Яніна Рыжэўская** з Хадароўкі, **Ян Карповіч** з вёскі Ягінт і **Гіпаліт Вінцэнцюк** з Ляўдэньшчызны. Вёска **Ляўдэньшчызна** наогул заслужыла на пахвалу і прызнанне. У мінулым годзе гэтая вёска заваявала трэцюю ўзнагароду ў маштабе ваяводства за вынікі ў рэалізацыі конкурсных задач „Беластоцкая вёска гаспадарная і культурная". Іншыя вёскі таксама змяняюць свой выгляд. Усё часцей паяўляюцца мураваныя жылыя і гаспадарчыя будынкі, знікаюць саламяныя стрэхі, сяляне будуюць тратуары і новыя, часта жалезныя агароджы, гаспадыні і дзяўчаты насаджваюць кветкі. Так ёсць у Ячне і Яцвежы Вялікай, і ў многіх іншых вёсках.

270 нашых найлепшых гаспадароў разам з 70 членамі Саюза сацыялістычнай вясковай моладзі будзе прадстаўляць Дуброўскі павет на Цэнтральных дажынках у Беластоку. Як усе іншыя паветы Беластоцкага ваяводства Дуброўшчына будзе мець „уласны" дзень. Пастараемся тады паказаць дажынкавым гасцям" усё гэтае, што ў нас найбольш каштоўнае. Да пабачэння на дажынках.

Запісаў **В. Рудчык**
фота аўтара

Што на гэта аграном?

На жаль, мала пахвальнага можна пачуць у сёлах Беласточчыны ў адрас дзейнасці працаўнікоў гмінных сельскагаспадарчай службы. Асабліва ў летні час гмінныя аграномы рэдкі госць на палетках у сялян. А ў ліпені ды жніўні якраз даспявае на полі ўвесь гадавы плён сялянскай працы. У гэты гарачы і працавіты час добрая кваліфікаваная парада агранома для селяніна мае надта вялікую вартасць.

Пра гэта зусім забыў Генрык Катовіч, гмінны аграном з Нарвы Гайнаўскага павету. У вёсцы Агароднікі, што знаходзіцца ў раёне яго дзейнасці, сяляне законтрактавалі звыш 40 гектараў бульбы. З вясны Г. Катовіч часта заглядаў у вёску, і сялянскія сходы праводзіў, і шмат карысных парад даў гаспадарам. Але вось улетку зусім пра Агароднікі забыўся. У гэтым годзе лета выдалася надта „ўраджайнае" на стонку. Гэты пражэрлівы каларадскі жук „высыпаўся" на агародніцкіх палях проста плоймаю, што і ратунку не было. Ездзілі сяляне з Агароднікаў да свайго агранома ў Нарву, прасілі дапамогі ў барацьбе са шкоднікам. Г. Катовіч абяцаў і апырскванне і машыны, але як толькі дзверы за сялянамі зачыніліся, адразу пра свае абяцанкі забыўся. А сяляне як маглі саматуж бульбу ратавалі ды абяцанага аграномам апырсквання чакалі. Аднак як не ваявалі яны на полі, усё ж стонка больш як палавіну бульбы аб'ела.

А што на гэта аграном Г. Катовіч ды гмінная рада ў Нарве? (іс)

Кансультацыя юрыста

Пытанне: Спадчынныя правы сцверджаны для трох асоб, з якіх адна знаходзіцца ад часу вайны ў Злучаных Штатах Амерыкі і мае грамадзянства гэтай дзяржавы, а працуе ў прамысловасці. Ці мае яна права да сельскай гаспадаркі? Ці можа яна атрымаць цэласць або частку гаспадаркі? Ці могуць ёй быць абніжаны сплаты?

Адказ: Асоба, якая мае грамадзянства іншай дзяржавы, захоўвае права да спадчыны ў сельскай гаспадарцы незалежна ад таго, ці з'яўляецца селянінам, ці працуе ў прамысловасці. Яна не можа атрымаць у выніку падзелу сельскую гаспадарку ані часткі сельскай гаспадаркі, а мае права да сплаты. Належная ёй сплата не можа быць абніжана ані разложана на раты.

Калі грамадзянін іншай дзяржавы ў выніку дабравольнага нефармальнага падзелу меў выдзеленую частку гаспадаркі, якую апрацоўваў у яго адсутнасці хто іншы, то карыстальнік гэтай часткі не можа набыць яе ўласнасці на аснове закону з 26 кастрычніка 1971 г. аб урэгуляванні ўласнасці сельскіх гаспадарак.

Вышэй сказанае адносіцца да грамадзян тых дзяржаў, у якіх польскія грамадзяне карыстаюцца з узаемнасці. Да такіх дзяржаў залічаюцца Злучаныя Штаты Амерыкі.

Пачатак на стар. 1

Нашы арлы

тронная, суперсучасная тэхніка: магнетафоны, фільмовыя праектары, эпідыяскопы і іншыя цуды, а ўсё гэта дзейнічае, як толькі націснуць адну кнопку. Вось зала сімуляванага палёту на рэактыўных самалётах. Запрашаюць мяне ў крэсла пілота. На некалькі мінут я ператвараюся ў лётчыка. Трэба сачыць за дзесяткамі ўказальнікаў, памятаць, як трымаць ногі, што рабіць з рукамі. Тут маладыя кандыдаты ў лётчыкі пазнаюць першыя тайны сваёй прафесіі. Іншая зала: сімуляваны паветраны бой. Нялёгка трапіць у звышгукавы самалёт. У гэтым я таксама пераканаўся. І яшчэ адна зала... і яшчэ... Усё гэта служыць да паглыблення эфектыўнасці абучэння майстраў паднебнага палёту.

Выходзім на паветра. Перад намі сапраўдны спартыўны камбінат.

— У ліпені гэтага года — інфармуе маёр Базылюк, — адбылася тут Спартакіяда вайсковых сярэдніх і вышэйшых школ, прысвечаная XXX-годдзю Людовага Войска польскага.


— Ці ў вашай школе сустракаеце сваіх землякоў?

— Здараецца. З Беластока, здаецца ёсць, з Чыжоў пад Гайнаўкай і з іншых мясцовасцей Беласточчыны. Гэта працавітыя і здольныя хлопцы. Кіраўніцтва школы іх хваліць.

Развітваюся з маёрам Базылюком, жадаючы яму поспехаў у працы. Запрашаю ў Беласток.

— Цяпер я вельмі заняты, — гаворыць ён. — Толькі што закончыў завочнікам Адміністрацыйна-праўную студыю Люблінскага ўніверсітэта і ў верасні гэтага года здаю экзамены на магістэрскі курс. Дзейсным пілотам ужо не магу быць, дык трэба папоўніць свае агульныя веды.

Віктар Рудчык
фота аўтара і архіў



...І яшчэ адна зала.

(Пачатак на стар. 3)

З песняй у Сопат

вацкі танцавальны калектыў (30 мінут). Канцэрт быў паўтораны 4 жніўня.

Аб самым мерапрыемстве. Ехалі мы на фестываль, прыехалі — на вочную стаўку. „Фалькларыстычныя канфрантацыі" — так называлася мерапрыемства, у якім мы ўдзельнічалі і якое праходзіла ад 1 па 9 жніўня. 1 і 2 выступілі ўкраінцы, 3 і 4 мы супольна са славакамі, 5 і 6 цыганскі „Табар", 7, 8 і 9 грэчаскі „Гелен".

Дзіўныя гэта былі „канфрантацыі". Да ўкраінскай праграмы ніяк не падыходзіла слова мерапрыемства а „Табар" і „Гелен", прафесіянальныя калектывы і, хоць мы іх не бачылі, параўноўваць з аматарамі цяжка. Здаецца таксама, калі б гэты марафон змясціць у двух днях і вывесці яго з бруднай цыркавай палаткі Летняга тэатру, дзе канфрантацыі адбываліся, пад адкрытае неба Лясной оперы — карціна была б іншая. А так, нягледзячы на добрую рэкламу, зацікаўленне мерапрыемствам было невялікае. (Ці не за дарагія білеты?)

І вывад для нас: без салiднай падрыхтоўкі (і не толькі мастацкага характару) не варта выпускацца на шырэйшыя воды. За вялікая рызыка. Што гэтым разам абышлося шчасліва — не доказ у падтрымку імправізацыі, якой па сутнасці і была наша паездка ў Сопат.

Г. Валкавыцкі

Беларуская літаратура
Аляксандар Баршчэўскі

Нашаніўская пара

ЯДВІГІН Ш. ЧАСТКА VI

Другой як бы выпадковай з'явай у творчасці Ядвігіна Ш. была яго драма „Злодзей". Выпадкова таму што, як мы ўжо сказалі, пісьменнік гэты быў перш за ўсё навелістам. Усё, што пісаў паза навеламі мела як бы выпадковы, — часовы характар. Гэтую выпадковасць можам звязваць і з яго паэзіяй, і з яго повесцю „Золата", і з яго публіцыстыкай і з яго драматургіяй. Многія аўтары адзіночаюць ад галоўнай лініі сваёй генеральнай зацікаўленасці і пішуць нешта не тыповае для сваёй творчасці. Часта такая з'ява выступае на пачатку творчага шляху, калі яшчэ пісьменнік не ведае характару свайго таленту, калі яшчэ не ведае, у якім жанры можна зрабіць найбольш. Аднак многія, ужо скрысталізаваныя пісьменнікі пішуць нетыповыя для сваёй творчай манеры творы. Такім чынам як бы здраджваюць сябе і здзіўляюць сваіх чытачоў, якія прывыклі асацыяваць данага пісьменніка з акрэсленым літаратурным жанрам.

У выпадку драматычнага твора Ядвігіна Ш. цяжка гаварыць аб „здрадзе" пісьменніка. Справа ў тым, што твор гэты быў напісаны на пачатку творчага шляху, калі яшчэ Ядвігін Ш. не ведаў характару свайго літаратурнага таленту і калі яшчэ не ведаў у напрамку якога літаратурнага жанра пойдзе яго развіццё — як пісьменніка. Значыць гэты драматычны твор не быў крокам ад галоўнай лініі, а толькі першым крокам у напрамку літаратурнай не вядомай яшчэ лініі. П'есу „Злодзей" напісаў Ядвігін Ш. пасля прыезду з Масквы ў Беларусь у сваім маёнтку Карпілаўка. Твор быў напісаны праўдападобна ў 1893 годзе, гэта значыць тады, калі абавязвала яшчэ забарона друку на беларускай мове. Пішучы па-беларуску свой, мабыць першы арыгінальны твор Ядвігін Ш. не мог лічыць на яго шырокае распаўсюджанне. Не гледзячы на гэта скарыстаў аднак не з рускай і не з польскай, а толькі з беларускай мовы. Чаму? Чым кіраваўся? Асветніцка-народніцкімі меркаваннямі, якія характарызавалі Дунін-Марцінкевіча? Ці крысталізаваным беларускім нацыянальным пераканаццем аб тым, што культура народа можа развівацца толькі ў нацыянальнай мове? Цяжка сказаць. Аднак няма сумненняў у тым, што пасля сутыкнення ў Маскве з моцнай нацыянальнай свядомасцю студэнтаў — прадстаўнікоў розных народаў Рускай імперыі Ядвігін Ш. прыйшоў да непахіснага вываду аб неадкладнай патрэбе культурнага развіцця Беларусі пры дапамозе беларускай мовы. Гэтым тлумачыцца і пераклад на беларускую мову апавядання Гаршына „Сігнал" і факт напісання па-беларуску п'есы „Злодзей". З вышэй сказанага магло б здавацца, што радыкалізм характэрны для жыцця ў Рускай імперыі ў канцы XIX ст. пакінуў да жыцця пісьменніка Ядвігіна Ш. і яго „Злодзея". Тэзіс такі трэба трактаваць з вялікай асцярожнасцю. Несумненна, палітычныя змены ў жыцці і атмасфера, з якою сутыкнуўся Ядвігін Ш. у Маскве спрыялі крышталізацыі яго нацыянальных пачуццяў. Пры гэтым аднак трэба сумнявацца ці гэтыя перамены ўплылі рашуча на грамадскі светапогляд Ядвігіна Ш. Сумненні гэтыя якраз і вынікаюць са „Злодзея". У гэтай п'есе пісьменнік паказаў здарэнні, звязаныя з паўстаннем 1863 года. Галоўныя героі твора — пан і селянін. Пан — гэта светлы характар, селянін — чорны. Усе станоўчыя маральныя ўласцівасці і вартасці звязаны ў п'есе з панам, усе адмоўныя — з селянінам. У сялянскай постаці пісьменнік не знайшоў ні адной станоўчай рысы. Прыпісаў яму выключна адмоўныя схільнасці. Сялянскі герой п'есы — гэта сімвал ляноты, недобрасумленнасці, ашуканства, зладзейства.

Такім чынам Ядвігін Ш. зрабіў крок назад у параўнанні з ідэалогіяй В. Дуніна-Марцінкевіча, які стараўся даказаць, што па сваёй натуры і пан і селянін — людзі добрыя. Ядвігін Ш. пазбавіў гэтай дабраты селяніна. У такой трактоўцы селяніна і праблемы вёскі вогуле выявілася тыпова шляхецкая, панская ідэалогія Ядвігіна Ш. Зразумела, што такая ідэалогія непрыемлівая для нашаніўскіх дзеячоў і нашаніўскай літаратуры.

З гэтай прычыны нашаніўцы рашуча адмоўна ацанілі „Злодзея". У такой сітуацыі Ядвігін Ш. быў прымушаны або адказацца ад свайго твора, або яго пераробіць. Перарабіў. Замест пана ўвёў у твор настаўніка-народніка, які развівае асвету сярод народа. Дзейнасць настаўніка мае змяніць звычаі, маральныя нормы, культуру, а тым самым і ўсё жыццё. Такім чынам Ядвігін Ш. зрабіў крок ад шляхецкай да народніцкай ідэалогіі. Да той ідэалогіі, якая акрэсліла ўжо ахарактарызаваную яго паэмку „Дзед Завала".

Трэба сказаць, што п'еса Ядвігіна Ш. карысталася значнаю папулярнасцю ў перыяд „Нашай Нівы". Ставілася яна многімі аматарскімі, мастацкімі гурткамі і тэатрам Буйніцкага. У п'есе былі несумненна зласбадзёныя праблемы вёскі і рысы чалавечых сапраўдных характараў. Усё гэта сустракалася з жывой рэакцыяй тагачаснага гледача.

ВЫНІКІ НАШАЙ ПРАЦЫ Ў ПЕРШЫМ ПАЎГОДДЗІ 1973 г.

Кожны з нас недзе працуе і гэтым чынам рэалізуе нейкую часцінку агульнанацыянальнага плана развіцця нашай краіны. Якія вынікі гэтай працы?

Адказ на гэтае пытанне дае жыхарам Беластоцкага ваяводства чарговае камюніке **Ваяводскага статыстычнага ўпраўлення** ў Беластоку. Перш за ўсё яно яшчэ раз пацвярджае вядомую і, на жаль, непазбягаемую ісціну, што з кожным годам памяншаецца плошча ворнай зямлі. Яна адыходзіць пад новыя будоўлі, пад дарогі і лес. Так было ў нас і ў мінулым паўгоддзі. На шчасце, у Беластоцкім ваяводстве ўсё яшчэ існуе нейкі запас нецалкам загаспадараванай зямлі, якая дае магчымасць утрымаць на тым жа самым ўзроўні агульную плошчу пасеваў.

Апошні чэрвеньскі перапіс паказаў, што сяляне Беластоцкага ваяводства шырэй чым у мінулых гадах пацікавіліся прамысловымі сельскагаспадарчымі культурамі. Больш яны сеялі цукровых буракоў, рапсу і бульбы. Пад агароднінай знайшлося на звыш 40% больш поля чым у мінулым годзе. Шматзначна, бо аж на амаль 36 прац., узрасло зацікаўленне трускалкамі. Адначасова крыху зменшылася паверхня пад збожжам. Што меркаваць аб гэтым?

Напэўна няма асноў, каб узнімаць лямант. Такі, а не іншы напрамак перамен у земляробстве **можа толькі сведчыць, што сельская гаспадарка Беластоцкага ваяводства ўсё ў шырэйшым маштабе пераходзіць на таварную гаспадарку**, што сяляне ўжо не клапоцяцца выключна аб тым, каб ад жніва да жніва неяк пракарміць сваю сям'ю. Яны захочуць цяпер парадачна зарабіць за сваю цяжкую працу. І таму агародніна, і таму трускалкі, або кантрактаваная бульба, таму рапс і льняная салома. Так і яно павінна быць, бо гэта правільны працэс.

Але ж што тады са збожжам? Яго ж пастаянна нам не хапае. Спецыяльна турбавацца няма чым. Нязначна паменшаную яго плошчу з нагрузкай рэкампенсуе прырост ураджайнасці. Ваяводскае статыстычнае ўпраўленне падае вынікі на дзень 30 чэрвеня 1973 года. Тады яшчэ немагчыма было мець поўнае ўяўленне аб сёлеташнім ураджаі. Цяпер аднак ужо вядома, што будзе ён найвышэйшы ў гісторыі Беласточчыны.

Такім чынам сяляне Беласточчыны поўнасцю апраўдалі гэты высокі давер партыі і ўрада, якія рашылі наладзіць у гэтым годзе цэнтральныя дажынкавыя ўрачыстасці менавіта ў Беластоку.

Таварны характар сельскай гаспадаркі Беластоцкага ваяводства пацвярджае таксама паспяховае развіццё жывёлагадоўлі. Вось рагатай жывёлы ў хлявах сялян на Беласточчыне налічвалася ў чэрвені гэтага года 736.500 штук. Ніколі дагэтуль столькі яе ў іх не было. На працягу аднаго года аднатавана звыш 7% прыросту. Асабліва цешыць тое, што сяляне астаўлялі многа цялят для далейшай гадоўлі. Колькасць маладой жывёлы павялічылася больш чым на 11%. За два гады будуць з іх поўнавартасныя каровы. Ужо цяпер гаспадыні на працягу толькі шасці мінулых месяцаў **прадалі дзяржаве 222 мільёны літраў малака.** Гэта сапраўдная рака малака, бадай што можна было б запоўніць ім мнагаводную Нарву.

Жывёлагадоўля — гэта не толькі рагаты статак. Свінней нашы сяляне любяць не менш. Іх лік — амаль паўтара мільёна і звыш дваццацідвухпрацэнтавы прырост — дадатковых паясненняў не патрабуюць. Хопіць толькі ведаць, што самае высокае развіццё свінагадоўлі (амаль 38%) наглядалася ў Сямяціцкім павеце, а найніжэйшае, бо толькі няпоўных 15%, у Гайнаўскім. Бедная Гайнаўшчына! Яна зноў служыць як адмоўны прыклад. Проста прыкра.

Бачым тады, што сяляне Беласточчыны мелі і будуць мець што прадаваць. Рагатай жывёлы прадалі яны звыш 80 тыс. тон, а свінней — больш чым 56 тыс. тон. Да гэтага трэба далічыць продаж кантрактаваных земляплодаў, агародніны і збожжа.

Гаворачы коратка, цяжкая праца сялянам аплацілася. ПКО інфармуе, што на ашчадных кніжках у канцы месяца чэрвеня гэтага года жыхары Беластоцкага ваяводства накапілі больш чым 4 мільярды злотых. Іх ашчаднасці ў параўнанні з мінулым годам павялічыліся па 31 прац. Да гэтага трэба яшчэ дабавіць звыш паўтара мільярда злотых на кніжках ашчадна-пазыкавых спулдзельняў, якія абслугоўваюць выключна сялян.

Што перш за ўсё за гэтыя грошы куплялі жыхары ваяводства?

Амаль 10 тыс. тэлевізараў і нямнога больш радыёпрыёмнікаў, столькі ж дамашніх халадзільнікаў і звыш 8 тыс. пральных машын. Асабліва высокі быў попыт на тэлевізары. У памешканнях жыхароў Беласточчыны знайшлося іх аж на 39 прац. больш, чым у мінулым годзе. Не ганьбавалі мы і менш трывалымі таварамі. Выпілі 2 мільёны літраў спірту і гарэлкі. Ды гэты лік не дае яшчэ поўнага ўяўлення аб нашым „п'янстве", бо статыстыка рэеструе колькасць алкаголю ў пераліку на чысты 100-працэнтавы спірт. Да гэтага дабавіць неабходна звыш 3 мільёнаў літраў віна і пітнага мёду. Выходзячы з гэтага можна зрабіць вывад, што жыццё нашае праходзіла працавіта, але і радасна.

М. Нурэцкі

(Працяг са стар. 3)

Што плёскаецца ў Валілаўскіх ставах



нак усім ПГР-ам, ну і тым самым гэтым аграмадным рыбакамбінатам сябра Андрэй Крычко, чалавек, які ў ніякія казкі не верыць. Яму, калі ласка, рэчаіснасць падавай! Напусціць вясною па яго загаду рыбакі ў сажалкі рыбку маленькую, і падсыпаючы ёй лубіну ды іншага корму, „пасуць" на падводных пасбішчах да восені. Тады і лавіць можна. Толькі што ў іх чамусьці рыбка толькі вялікая ловіцца. Карпы па 1—1,5 кг. Якраз на калядны стол. Калісьці ПГР — Валілы купляў зарыбак у Дайлідах каля Беластоку, плоцячы за яго штогод сотні тысяч.

Ніякім чынам не ўдавалася выгадаваць уласнай моладзі. Пасля даручылі гэтую важную справу Антону Языкаву. Гэты скромны, непрыкметны дагэтуль працаўнік аказаўся ў справах рыбагадоўлі чуць не прафесарам.

У хуткім часе выгадаванай моладзі пачало хапаць не толькі сабе. Можна было і з другімі падзяліцца, з вялікай, разумеецца, карысцю для ПГР.

У фінансавым разліку шчупленькі, сярэдняга ўзросту Янтон Языкаў даў прадукцыю большую, чым брыгада самых здаровых юнакоў. „Шмат ён у мяне варты, — заўважае часта дырэктар Крычко. — Яму я і за тое зарабіць даю!"

А сябра Антон далей ціхенька правіць нешта над нейкім стаўком. Ён даглядае госця, які прыбыў аж з Усходняй Азіі. „Белы Амур" называецца. Па латыні адмыслова „Ctenopharyngodon idella". Малюсенькі ён яшчэ. Вядома аднак, што ў сябе дома ён дасягае вагі да 30 кг і даўжыні да 120 см.

Па выгляду ён у параўнанні з карпам проста прыгажун. Зеленаватая спіна, цёмна-залацістыя бакі. Па ўскраю кожнай чашуйкі какетлівы цямнейшы абадок. Пры тым ён вегетэрыянец. Мясам яго не кармі, а давай салатку з водарасляў ды ў прыкуску трысняку ці іншай зелені.


Нездарма „Белым Амурам" карыстаюцца ўсюды там, дзе буяе непатрэбная вадзяная расліннасць. Ён ачышчае зарастаючыя зеленню каналы. Яго ўпускаюць у халадзільныя вадасховішчы пры цеплаэлектрастанцыях. Ён сцеражэ доступу да плаціны. І работу сваю ён ведае. Выгрызе кожную траўку пад корань. Пакуль што ён плёскаецца, маленькі, пад доглядам сябры Языкава. Гэты ўмелец напэўна выгадуе з яго саліднага тоўстабокага працаўніка. З тым, што мы з вамі, будучы не зусім вегетэрыянцамі, можам спадзявацца, што па загаду дырэктара Крычко ён нападзе і ў крамы, а тым самым і на нашы сталы. Вы сабе як хочаце, а я ўжо пачаў вывучаць адпаведную літаратуру. Трэба ж на ўсякі выпадак ведаць, чым гэту рыбку запіваюць.

Ларс

ФАЛЬКЛОР

ЖАРТОЎНАЯ





Сею рэдзьку, сею рэдзьку,
Сею, пасеваю.
Расці, рэдзька, зялёная —
На зіму схаваю.
Расці, рэдзька, зялёная —
На зіму схаваю.
Не з кім сесці рэдзькі есці —
Людзі кажут — горка.
Ой, ні буду жэніцісе —
Кажут — б'еціца жонка.
Ой, ні буду жэніцісе —
Кажут — б'еціца жонка.
— Ой ты, хлопча дураваты,
Выбірай такую,
Коб ні біла і любіла
Та шчэ й маладую.
Коб ні біла і любіла
Та шчэ й маладую.
Запрагай ты, бацьку, пеўня
І курку чубату,
Я паеду на Украіну
Па дзеўку багату.
Я паеду на Украіну
Па дзеўку багату.
На Украіні хаты густо
Вецер ні правее —
Сама маці ложкі мые,
Бо дочка ні ўмее.
Сама маці ложкі мые,
Бо дочка ні ўмее.
Як заехаў я ў сваты —
Папрасілі сесці.
Паставілі бараболю
Нелуплену есці.
Паставілі бараболю
Нелуплену есці.
Я на тую бараболю
Скоса пагльядаю,
Ля печы сядзіць дзяўчына —
На ее маргаю.
Ля печы сядзіць дзяўчына —
На ее маргаю.

Ад Клаўдзіі Домань, 1912 года нараджэння, вёска Новая Воля Беластоцкага павету запісаў 22 чэрвеня 1973 года Мікалай Гайдук. З магнетафоннай стужкі ноты запіс зрабіў Эдуард Гойлік.



ВЕСЕЛА І ПРЫЕМНА

Узорным прыкладам добрага супрацоўніцтва мясцовых грамадскіх арганізацый з акруговай млечарняй у Бельску з'яўляецца летні дзяцінец у Агародніках Бельскага павету. А таму, што варта, каб у наступным годзе следам Агароднікаў пайшлі іншыя мясцовасці, пішам аб іх трохі шырэй.

Вёска Агароднікі паложана ў даволі „незаходным" кутку Бельскай гміны, нават да бліжэйшай аўтобуснай астаноўкі адтуль будзе кіламетраў чатыры. Але жывуць там працавітыя і дбайныя гаспадары, якія высока цэняць гадоўлю малочнага быдла. Напрыклад, Васіль Грыгорчук гадуе 18 штук быдла, у тым ліку 7 дойных кароў. Дастаўляе ён штодня звыш 70 літраў малака. Калі ж улічыць, што ў Агародніках больш 80 гаспадарак, хоць некаторыя і меншыя, чым у Васіля Грыгорчука, усё ж немалы струмень малака плыве кожнага дня ў бельскую акруговую млячарню з гэтага сяла. І млячарня знайшла вельмі прыемную форму ўзнагароды для сялян з Агароднікаў: па яе ініцыятыве ад 15 ліпеня па 15 жніўня гэтага года там працаваў летні дзяцінец з поўным дзённым харчаваннем дзяцей. На самы цяжкі ў сяле час жніва 22 дзяцей ад 6 гадзіны раніцы і да 6 гадзіны вечара мела цікавыя заняткі, гуляла, адпачывала і з апетытам спажывала смачныя падабедкі, абеды ды падвячоркі. Добрая рэч: і для малалеткаў і для іх бацькоў, занятых жнівам!

Праўда, не толькі адна млячарня прычынілася да арганізацыі і забеспячэння дзяцінца ў Агародніках. Яна забяспечыла аплату кіраўніка і кухаркі, дала забаўкі і дастаўляла час ад часу малочныя прадукты. Па ініцыятыве старшыні агародніцкага гуртка вясковых гаспадыняў Вольгі Перавой бацькі забяспечвалі штодзённа дзяцінец у варыва, малако і фрукты, з свае „выпазычальні" далі патрэбны посуд. Кіраўнік дзяцінца, настаўніца Вольга Ігнацюк, „пахадзіла" і „пастукала" ў іншых установах, і ў выніку яе энергічных захадаў ваяводскае праўленне Апекі над маткай і дзіцём забяспечыла аплату выхавацельніцы, маладой настаўніцы Любе Ануфрыюк, гмінная рада нарадовая ў Бельску дала дапаможнікі і цацкі, міжгуртковая машынная база ў Пасынках „падкінула" 1000 злотых на харчаванне. Бацькам жа прыйшлося даплаціць усяго па 100 злотых ад дзіцяці за цэлы месяц побыту ў дзяцінцы.

І як жа прыемна было бачыць бацькам, як іх дзеці-малалеткі пад кваліфікаванай апекай займаліся і гулялі ў школе, хадзілі на экскурсію ў лес або загаралі над рэчкай Арлянкай. (іс)

КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ З МІНСКА

◆ КАМПІЗІТАР ◆

Анатолій Багатыроў

Шлях на музычны Алімп быў пройдзен ім нарэдкасць хутка і яскрава. Успамінаецца, як адразу горача прыняла грамадскасць кантату „Сказ аб Мядзведзісе“, якую выпускнік Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Анатолій Багатыроў напісаў у 1937 годзе да стагоддзя з дня трагічнай гібелі А. С. Пушкіна.

Пасля быў вялікі поспех оперы „У пушчах Палесся“ — твора, у якім новым жыццём зажылі героі вядомай аповесці „Дрыгва“ Якуба Коласа. Паказаная ў 1940 годзе ў час Дэкады беларускага мастацтва ў Маскве на сцэне праслаўленага вялікага тэатра, гэтая опера прыцягнула ўсеагульную ўвагу.

Так, у няпоўныя 27 год Анатолій Багатыроў стаў адным з першых у краіне лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі СССР, атрымаў ганаровае званне заслужанага артыста сваей рэспублікі, быў выбран дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР і кіраўніком яе кампазітарскай арганізацыі.

А пасля, у цяжкія дні ваеннага ліхалецця адна за адной узнікаюць багатыроўскія кантаты „Беларускім партызанам“ і „Ленінградцы“, у якіх на крылах хвалюючых мелодый кампазітара нясліся да людзей палымяныя паэтычныя прызывы беларускага песняра Янкі Купалы і казахскага акына Джамбула.

Перагорнем яшчэ некалькі старонак з жыцця Анатолія Багатырова, і мы ўбачым, што да названых ужо твораў, да цыклаў рамансаў, інструментальных п'ес, хораў, створаных у тыя ж гады, дабавіліся дзве сімфоніі, опера „Надзежда Дурава“, кантаты „Леніну слава, і „Беларусь“, новыя камерныя і вакальныя і інструментальныя творы. У іх, як і раней, аўтар хвалююча расказвае пра сучаснае жыццё свайго народа, аб яго гістарычным мінулым. Яго творы глыбока самабытныя па мове, ён застаецца верным нацыянальным вытокам творчасці, рэалістычнай накіраванасці мастацтва праслаўляючага жыццё, гуманізм, дружбу народаў свету.

Ці ж не таму сярод найбольш яскравых партытур і клавіраў А. Багатырова тыя, у якіх побач са строфамі беларускіх паэтаў Максіма Багдановіча і Максіма Танка, Пятруся Броўкі і Пімена Панчанкі, Аркадзія Куляшова і Паўлюка Труса на роўных суседствуюць творы Лермантава і Шаўчэнкі, Анны Ахматавай і Шэкспіра, многіх другіх уладароў айчыннай і сусветнай паэзіі. Ці ж не таму чуючы ў яго музыцы гамонку беларускіх палёў і пушчаў, рэк і азёр, думы і клопаты, творчы парыў і радасці народа, так цяжка ўявіць, што кампазітар не запазычае з фальклорных вытокаў. Так, яго музычная мова — такая яскравабеларуская — створана не цытатай, а пранікненнем у дух народнай мелодыі, зваротам да самага яе кораня.

У пасляваенныя гады мы сустракаемся з Анатоліем Багатыровым і ў новай творчай якасці. Як і яго выдатны кансерваторскі педагог, — сябар і вучань Балакірава і Рымскага Корсакава, прафесар Васіль Залатароў, выхаваўшы ў трыццатыя гады цэлае пакаленне беларускіх кампазітараў, — А. Багатыроў пачынае кіраваць класам кампазіцыі. І сёння, бадай, няма ні аднаго вядомага ў рэспубліцы і за яе межамі кампазітара сярэдняга і малодшага пакалення, аб якім можна было б сказаць, што ён не з'яўляецца вучнем прафесара Багатырова. Сярод іх Г. Вагнер і Е. Глебаў, Ю. Семяняка і І. Лучэнак, Д. Смольскі і С. Карцес, Э. Тырманд і А. Мдзівані і шмат іншых.

Але велізарная педагагічная праца, кіраўніцтва кансерваторскай кафедрай кампазіцыі, сарakагадовая дзейнасць у праўленні Саюзаў кампазітараў СССР і Беларусі, многія іншыя грамадскія абавязкі ніяк не аказваюць адмоўнага ўплыву на творчую актыўнасць Анатолія Багатырова. Як і раней усё новыя творы выходзяць з-пад яго пяра, дастаўляючы радасць як шырокай аўдыторыі слухачоў, так і высока патрабавальным калегам-кампазітарам (а сярод іх і Дзм. Шастаковіч, Ціхон Хрэннікаў, Юрый Свірыдаў і другія карыфеі мастацтва). Не выпадкова выдаваемыя творы А. Багатырова, іх запісы на грамафонных пласцінкі так хутка набываюцца ў краіне. Не выпадкова музыка кампазітара з такім поспехам прымаецца ў многіх канцэртных залах у нас і за мяжой. (Софія, Варшава, Будапешт, Берлін). А якія цёплыя пісьмы атрымлівае аўтар ад слухачоў пасля выканання гэтай музыкі.

Актам высокага прызнання творчасці Анатолія Багатырова з'яўляецца прысуджэнне Дзяржаўнай прэміі Беларускай ССР яго кантаце „Беларусія песні“. Твор гэты ўнікальны па замыслу, з'яўляецца сведчаннем надзвычайнага майстэрства сапраўды нацыянальнага мастака. Сапраўды, уступіць у „спаборніцтва“ з народнай песняй: стварыць сваю арыгінальную песню і параўнаць яе з фальклорнымі, на развіцці якіх пабудаваны ўсе алоўнія пяць частак кантаты, можа толькі кампазітар, валодаючы ўсімі тайнамі мастацтва. Іменна кампазітар, чыя музыка не толькі ўзбагачана народнай песнятворчасцю, але і ў сваю чаргу, сама яго ўзбагачвае.

13 жніўня г.г. народнаму артысту Беларускай ССР, прафесару Анатолію Багатырову споўнілася 60 год. Гэта не мала для таго, хто вычарпаў сябе як тварэц, хто хоча далей жыць былой славай і заслугамі. Аб кампазітары Багатыровe такога не скажаш. Неяк яму было задана пытанне: у чым заключана творчае шчасце мастака і ці зазнана яно ім? Адказ не пакінуў ніякіх сумненняў у тым колькі стварыць замышляе яшчэ юбіляр. Адказ гучаў: „Я ніколі не адчуваў яшчэ поўнасцю такога шчасця, бо не адчуў усведамлення, што вычарпаў свой доўг мастака перад Радзімай і народам“.

Як добра, што слухачы музыкі Анатолія Багатырова будуць знаходзіць столькі прыгажосці і натхнення ва ўсіх яго новых і новых творах гэтага цудоўнага тварца.

Н. Нісневіч





ЯК ЗВАРЫШ, ТАК І З'ЯСІ

КВАШОНКІ

Пакуль запахне мілы арамат кіслай капусты, якую вы паставіце ў бочцы на зіму, можна падрыхтаваць у невялікіх колькасцях іншыя квашонкі, на якія сёння падамо рэцэпты.

КВАШОНКА З ЧЫРВОНАЙ КАПУСТЫ

На 5 кг чырвонай капусты трэба ўзяць кілаграм яблыкаў, 1 чайную лыжку насення ўкропу, 10 дэкаў солі.

З чырвонай капусты зняць верхнія пашкоджаныя лісткі, памыць, вельмі тоненька пашаткаваць. Качан і тоўстыя лісцяныя нервы сцерці на бурачанай тарцы. На гэтай жа тарцы сцерці і яблыкі. Вымяшаць капусту з яблыкамі, соллю і насеннем укропу. Каменны посуд вымыць гарачай вадой з мылам, выпаласкаць, выпарыць. Класці паступова капусту ў посуд, убіваючы, каб не засталося вольнага месца паміж кавалкамі пашаткаванай капусты. Капусту накрыць ільняным палатном, пасля талерачкай, на яе палажыць камень. Праз некалькі дзён капуста будзе заквашана і можна будзе яе падаваць у якасці салата да ўсіх страў на працягу дня. Квашонку перад падачай можна запраўляць цукрам, алеем, або маянезам.

КВШОНКА З ВАЛОШСКАЙ КАПУСТЫ З ЖУРАВІНАМІ

На 5 кг валошскай капусты трэба ўзяць 75 дэкаў журавін, 8 дэкаў солі, 1 пучок зялёнага ўкропу.

Зняць з валошскай капусты верхняе лісце, памыць, а пасля дробна пашаткаваць яе. Журавіны перабраць, памыць, вымяшаць з пашаткаванай капустай, дадаць дробна нарэзаны ўкроп і соль, добра вымяшаць. Прадукты палажыць у каменны посуд, убіць, прыкрыць палатном, талерачкай, на яе палажыць камень. Перад падачай добра было б спырснуць капусту алеем.

КВАШОНКА З РОЗНАЙ ГАРОДНІНЫ

На 2 кг цукровай капусты бярэм 1,5 кг морквы, 0,5 кг буракоў, 0,25 кг селераў, 0,25 кг пораў, 0,25 кг карэнняў пятрушкі, 0,25 кг яблыкаў, 7 дэкаў солі.

Капусту дробна пашаткаваць, абабраную і памытую гародніну і яблыкі сцерці на бурачанай тарцы, поры альбо замест іх цыбулю дробна нарэзаць нержавеючым нажом. Гародніну вымяшаць разам у місцы, дадаць соль. Укладаць яе ў каменны посуд, шчыльна ўбіць, прыкрыць палатном і талерачкай, палажыць на талерку камень. Атрыманую квашонку падаваць, запраўіўшы цукрам і алеем.

Гаспадыня

МАЛА, АЛЕ ЦІКАВА

Чалавек, які пражыве 70 год з'ядае амаль 100 тон ежы. Гэта ў 1250 разоў больш, чым важыць яго цела.

За гэты ж час ён праспіць 23 гады, на размову прызначыць 13 год, на ежу 6 год і зробіць 497.000.000 крокаў.

Д. МАРОЗАЎ



КРАХ АПЕРАЦЫІ „ЦЫКЛОН“

НАД ФРОНТАМ НОЧ

Цёмная верасьнёўская ноч стаяла над фронтам. Але вайна не ведае розніцы паміж днём і ноччу. Пад светамаскіроўкай па абодвух баках лініі фронту ваеннае жыццё ішло сваім парадкам.

Са скрытымі агнямі ў апраметный цемры імчаліся да фронту, трывожна пастукваючы на стыках рэек, эшалоны. Дзесьці пры святле газовак у бліндажах схіляліся над картамі камандзіры савецкіх дывізій, адзначаючы шлях пройдзены і той, які яшчэ трэба прайсці ў нялёгкіх баях. Дзесьці, закрыўшыся з галавой маскіровачнай плашч-палаткай, паўзлі ў начны пошук салдаты-разведчыкі.

Начны эфір над фронтам быў напоўнен радыёсігналамі. Яны ляцелі, то заміраючы, то сплятаючыся ў суцэльны клубок кропак і працяжнікаў, галасоў, лічбаў...

Асветлены зялёным агеньчыкам сваёй рацыі, хутка працаваў ключом берлінскі газетчык Фрэд. І, выбіраючы яго сігналы з бльытаніны галасоў, іх прымаў чуйны прыёмнік пад Масквой, на радыёстанцыі Цэнтра савецкай разведкі. Пад алоўкам шыфравальшчыка ледзь чутныя сігналы ператвараліся ў радкі:

„Карэспандэнт 75 паведамляе каардынаты групы „Цыклон-Поўдзень“, пачатак аперацыі паскоран. Пачнецца заўтра. Паўтараю: пачатак заўтра...“

У перадгор'ях Карпат, за дзвесце кіламетраў ад лініі фронту, у савецкім тыле, на закінутым хутары, уздрыгваючы ад начнога холаду і страху, уключыў сваю партатыўную рацыю і Мікола Скляны.

Зноў, як і ўсе гэтыя дні, цэнтр абвера адказаў без затрымкі, і лейтэнант Кругер, які сядзеў побач з радыстам, прадыктаваў:

— „Камандзіра групы прыняць гатовы. Усё ў парадку“, — І, пачакаўшы, пакуль Скляной закончыць перадачу, дадаў па руску: — Ну што ж, раней, дык раней. Менш эшалонаў пройдзе да фронту. Так, Іван?

...А па цёмным загарадным шасэ з Берліна на сакрэтны ваенны аэрадром імчалася некалькі машын са светамаскіровачнымі сінімі падфарнікамі. Людзі ў першай машыне — шэрым фургоне з ваенным крыжам на борце — нетаропка перагаворваліся:

— ...І тут, Мішэль, уяўляеш сабе, Клец гаворыць: „Я еду з вамі!“.

— Так, момант не з прыемных. Але чаму ты выбраў „Мядзведзя“?

— Ты ведаеш, я не выбіраў. У мяне быў спіс машын, і сярод іх значыўся нумар грузавіка з „Мядзведзя“. Клец захацеў туды з'ездзіць. Ну, а потым я падумаў, што будзе лепш, калі ён сам цябе знойдзе.

— А як ты здолеў пазваніць мне?

— Гэта было не складана. Я паехаў запраўляць машыну. Цяжэй было прыцягнуць паўтары гадзіны, каб даць сабе час даехаць да „Мядзведзя“. А ты добра трымаешся. Але глядзі, не перахоплівай. Мельцар больш вопытны за Клеца. Ты добра пераклеіў фатаграфію на пасведчанні. Давялося пакорпацца?

— Твая школа. Да твайго званка я быў ужо гатовы.

— Прадумай яшчэ раз кожнае слова. І вось яшчэ што: абавязкова адразу ж пасля прызямлення звяжыся з нашымі. Яны папярэджаны. Цяпер памаўчым. Перад дарогай...

Кіламетры за тры ад фургона, наганяючы яго, ішоў „опель-капітан“. На заднім сядзенні падпалкоўнік Мельцар гаварыў Клецу:

— ...але ж і обер-лейтэнант Лібель прымаў удзел у пошуках!

— Ваш Лібель птушанё ў такіх справах. Ён шукаў бы яшчэ двое сутак. У Гамбургу ў нас бывалі і не такія выпадкі.

Мельцар змоўк, і раптам простая здагадка азарыла яго. Ну вядома ж! Як ён раней гэтага не разумеў? У Клеца ёсць свая сувязь з капітанам Шварцбрукам. Напэўна Шварцбрук паведаміў Клецу, што прыбыў і адпачывае ў «Мядзведзі» Оберштурмбанфюрэр і капітан разыграваюць усю гэту гісторыю, як па нотах. Вось чаму Клец так упэўнена паехаў у кабарэ. Гэты былы паліцэйскі не такі просты, як здаецца, з ім неабходна быць больш асцярожным!

— Я думаю, — сказаў Мельцар, што для ўсіх нас будзе лепш забыць гэту гісторыю з пошукамі. Загад аддадзен — мы ўдзячны Лібелю і вам.

Клец не адказаў. Ён загадкова, як здалося Мельцару, усміхнуўся.

Яшчэ ў двух кіламетрах ззаду бясшумна ляцеў па асфальце велізарны лакіраваны «хорх». Генерал Крэбс, адкінуўшыся на мяккае сядзенне, маўчаў, паглыблены ў свае думкі. Яму не было аб чым размаўляць ні з ад'ютантам, ні з шафёрам. Ён думаў толькі аб тым, што яго асабістая прысутнасць на аэрадроме дасць яму потым права гаварыць, што ён, а не хто-небудзь іншы сваімі рукамі арганізаваў гэту аперацыю.

(Працяг будзе)

ТРЫБУНА чытачоў

КАЗІК ВАШКОВЯК

Казік Вашковяк жыве на станцыі Грыгароўцы, што ў Бельскім павеце. Усе сяляне вёскі ведаюць яго, як добрага гаспадара, а таксама як цікага культурнага хлапца. Казік гаспадарыць разам з маткай і малодшым братам на невялікай гаспадарцы. Дзякуючы добрай падрыхтоўцы глебы і мінеральным угнаенням вынікі ў яго вельмі добрыя. Вашковяк у хуткім тэмпе ўводзіць механізацыю і развівае гадоўлю. Вялікую падтрымку ў гаспадарцы дала электрыфікацыя, праведзеная вясной гэтага года.

Аднак Казік — гэта не толькі гаспадар. Ён вядомы таксама, як самы лепшы футбаліст грыгароўскага ЛЗС-у і спявак хору „Васілёчкі". Хор гэты існуе пры бельскім аддзеле БГКТ.

Многа пажаданняў усім тым, хто апрача працы на гаспадарцы, знаходзіць час на спорт і культурную дзейнасць.

Няхай будзе на нашых вёсках штораз больш такой моладзі, як Казік!

Міхась Інфармацкі



БАБРЫ

Сонца прасвечвае сетку лістоўя,
Сыпле янтару багаты сеў.
Глянуць угору — ужо каля поўдня...
Здалёку чуваць серабрысты спеў.

Хлюп! Што за ліха! Чаго ж ў багно
лезці?
Гнецца пад ботам мяккая гразь.
Гэтае трэба хутчэй перализці!
Вой! Што такое? Штосць шляпнула:
плясь!

А вось і раўчук — тонкая нітка,
Гэзліўся шырока, як рэчка.
Сонца на воду свеціць праз сітка
Лісця, цёплае ўсё, як печка.

Тырчыць пасярэдзіне з гразі і мулі
Чорная тама з галінак-галін.
Вы чулі пра гэта? Напэўна ўжо
чулі —
У вадзе сярод лесу бабруюць бабры.


ПАД СТРЭХАЙ

Пылам прыкрыты
павуціны.
Летні пах схаваўся
пад дахоўкай.
Пад нізкай бэлькай
сохнуць маліны
з васковымі лісцямі.

Крамяных яблык пах асенні
Пад крокваў блукаецца сонны.
А ў кутку клубіцца хвалі
Белай і шэрай авечай воўны.

Міра Лукша
Школа ў Семяноўцы

НАШЫ КРАЯВІДЫ



Дарога з Лукі ў Семяноўку ў Гайнаўскім павеце — адзін з найпрыгажэйшых і найчысцейшых куткоў ваяводства.

Фота **В. Буры**

Чаму астаўся Востраў Новы

У Сакольскім павеце вельмі мала асталося вёсак з невыбрукаванымі вуліцамі. Але нідзе не бывае так гразка, як у вёсцы Востраў Новы. Увосень ці вясной нельга тут прайсці без новых гумовых ботаў. Тут можна так угразнуць, што і ногі паламаць. Такі выпадак ужо здарыўся. Гаёвы Уладзімір Парфенюк ішоў аднойчы з лесу, з працы і на вуліцы ў Востраве Новым зламаў нагу.

Ці ж няма рады на ўсё гэта? Калі ўжо нельга хутка выбрукаваць вуліцы, можна хоць падсыпаць яе жвірам і заладжыць два пропусты, каб вада магла сцякаць і адыходзіць з вуліцы.

Думаю, што найперш самі жыхары вёскі павінны крыху даць з сябе добрай волі і працы, а гміна ў Шудзялове таксама не адмовіць сваёй дапамогі.

А.С.

На станцыі ў Белавежы

Белавежа — турыстычны пасёлак, мае многа недахопаў. Адзін з іх, гэта тое, што ў гэтым пасёлку няма добрай станцыі. Пачакальня, якая знаходзіцца разам з білетнай касай, такая малая, што не памесціцца ў ёй нават 10 чалавек. Многа людзей з Белавежы даязджае да працы ў Гайнаўку і, калі падае дождж, многія з іх мокнуць. Далей — пад дрэвамі, якія растуць побач станцыі стаяць толькі дзве лаўкі. А напэўна ж усе, хто чакае на цягнік летнім гарачым днём, хочуць пасядзець на лаўцы ў цяню.

Усё яшчэ няма ў прыгожай турыстычнай Белавежы адпаведнай станцыі. Хочацца ведаць, калі будзе яна будавацца?

К. Т.



Дарагое „Сэрцайка"!

Мне 17 год. Жыву я разам з бацькамі ў горадзе, але маю на вёсцы бабку і дзеда, ды яшчэ двух дзядзькоў з сем'ямі. Вёска гэта не вельмі далёка ад нашага горада і я іх часта наведваю. А ўжо канікулы, дык абавязкова там праводжу. У вёсцы шмат моладзі, ёсць клуб, святліца і моладзь тут умее культурна правесці свабодны час. Нядаўна ў гэтай вёсцы быў фэст. Выпаў ён якраз у нядзелю, дык моладзі сабралася тут вельмі многа. Прыехалі тыя, што працуюць у горадзе са сваімі сябрамі і сяброўкамі. Была гучная забава з дабровым аркестрам. Тут я пазнаёмілася з прыгожым бландзінам Янкам, які жыве ў гэтым жа горадзе, што і я. Танцавалі мы разам увесь вечар, а потым ён адвёў мяне да маёй бабкі. На развітанне мы дамовіліся, што спаткаемся ў горадзе ва ўмоўленым месцы. Я яшчэ падала яму свой дамашні адрас. Янэк назаўтра рана ад'ехаў у горад. З нецярпеннем чакала я дня, калі паеду на спатканне. Урэшце, як кажуць, „адчаканіўшыся на апошні гузік" я чакаю на свайго прыгажуна. Чакаю, але здарма. Не прыйшоў. Мне стала вельмі прыкра. Са слязьмі ў вачах вярнулася дамоў. І не магу сабе ўявіць, што сталася? Чаму не прыйшоў? Ён жа так прасіў, каб абавязкова я прыйшла. І вось як усё адвярнулася. Не ведаю, што рабіць. Мо' давядацца ў таго хлопца, да якога ён прыехаў тады яго адрас і напісаць, спытаць аб прычыне, чаму не прыйшоў? Але ці выпадае мне першай да яго пісаць? Што ты „Сэрцайка" мне параіш?

Крыся з Б.

Крыся! Мне здаецца, шукаць адрасу і пісаць да Янка няма патрэбы. Ён жа ведае, дзе ты жывеш. І вы ж з аднаго горада. Калі яму будзе на табе сапраўды залежаць, ён напэўна цябе знойдзе. А калі не, дык і твае пісьмы не памогуць. А мо была нейкая сур'ёзная прычына, па якой ён на спатканне не прыйшоў. Усяляк жа ж можа быць. Пакуль што, пэўна, розна можна думаць. Нічога іншага табе не магу параіць як чакаць. Час выясніць справу. Калі праз даўжэйшы час Янэк не паявіцца, значыць забыў. Дык і табе нічога іншага не астаецца, як зрабіць тое ж самае. Але не перамайся. Ты маладая і яшчэ не аднаго прыгажуна спаткаеш!

Сэрцайка

Крама ў Тапарках

Нядаўна ў вёсцы Тапаркі, на Гайнаўскай зямлі была адкрыта крама. Гэта было важнае здарэнне ў жыцці вёскі. Дагэтуль жыхары вёскі хадзілі за пакупкамі ў суседнюю вёску Сакі, а нават у Кляшчэлі. Новая крама ў Тапарках знаходзіцца ў хаце Ніны Бакун, а прадаўшчыцай з'яўляецца Галіна Бакун — свая дзяўчына з вёскі.

Пра тое, каб у Тапарках была крама, паклапацілася мясцовая партыйная арганізацыя разам з жыхарамі вёскі.

Мікалай Панфілюк

Дзе знайсці беларускую грампласцінку?

Ужо некалькі год падрад я надарэмна шукаю грампласцінак з награннямі беларускіх песень. І здзіўляе мяне факт, што ў раёне, дзе пражывае беларускае насельніцтва не можна купіць у ніякай краме гэтакіх грампласцінак.

Пра іх я запытаўся ў Беластоку ў краме на вуліцы Сянкевіча. Там прадаюць розныя грампласцінкі. І таксама пачуў адказ, што няма. А я ж не сумняваюся, што награнні такіх вядомых калектываў, як „Песняры", ці аддзельныя беларускія песні існуюць і трэба, каб і яны паяўляліся ў нашых крамах.

Запатрабаванне беларускага насельніцтва Беласточчыны ў гэтай галіне павінна лічыцца. Прыгожай музыкі, ці прыгожых песень, зрэшты, кожны ахвотна будзе слухаць. Таму аднак трэба забяспечыць нашы крамы ў грампласцінкі з беларускай музыкай і песнямі.

Пётр Германюк
Аўгустуў

У АДКАЗ НА НАШУ КРЫТЫКУ

Адказвае Аддзел здароўя і грамадскай апекі Прэзідыум ПРН у Гайнаўцы. Справа Надзі Бобік з Ласінкі.

W odpowiedzi na Wasze pismo, Wydział Zdrowia i Opieki Społecznej Prezydium Powiatowej Rady Narodowej w Hajnówce, informuje że zarówno u Ob. Bobik Nadziei zam. Łosinka jak też u Ob. Nadziei Bołtruczuk zam. wieś Klejniki zostały przeprowadzone wywiady społeczne w miejscu ich zamieszkania.

Ob. Nadzieja Bobik w myśl Instrukcji Nr 5/68 Ministra Zdrowia i Opieki Społecznej z dnia 29 lutego 1968 r. w sprawie udzielenia pomocy społecznej w formie świadczeń pieniężnych, (Dziennik Urzędowy Ministra Zdrowia i Opieki Społecznej Nr 6 z 1969 r. poz. 33) do pomocy społecznej w formie zasiłku pieniężnego nie może być zakwalifikowana. Albowiem Ob. Nadzieja Bobik otrzymuje rentę po zmarłym mężu na troje dzieci w wieku szkolnym 1350 zł. miesięcznie. Uprawia również w części **gospodarstwo rolne o pow. ogólnej 3,05 ha** o przychodowości rocznej 7.550 zł. W uprawie gospodarstwa pomaga miejscowe kółko Rolnicze. Należności wobec Państwa nie reguluje. Zwróciła się o ulgę w podatku gruntowym do Urzędu Gminy Hajnówka. Tut. Wydział wystosuje odpowiednie pismo w tej sprawie z prośbą o pozytywne załatwienie sprawy. Obywatelka N. Bobik jest zdolna do wykonywania pracy fizycznej, nie posiada żadnej grupy inwalidzkiej. Wydział Zdrowia i Opieki Społecznej poczynił równocześnie starania w Sądzie Powiatowym dla Nieletnich w Bielsku Podlaskim o umieszczenie trojga dzieci w Domu Dziecka. Nadmienić należy, że wymieniona poprzednio zamieszkiwała w Hajnówce i miała zapewnione mieszkanie, mogła równocześnie podjąć pracę zarobkową, jednakoż z nieznanych przyczyn wyjechała do brata, a później zamieszkała na kol. Łosinka, gdzie przebywa do chwili obecnej. Podkreślić należy, że petentka jest kobietą mało zaradną i nie troszczy się o rodzinę.

Jeżeli natomiast chodzi o inną pomoc tut. Wydział nie jest w stanie zapewnić.

Natomiast Ob. Nadzieja Bołtruczuk zam. Klejniki jest również wdową, lecz w świetle wyżej cytowanych przepisów Ministerstwa Zdrowia i Opieki Społecznej do pomocy pieniężnej nie kwalifikuje się ze względu na to, że posiada i uprawia w całości gospodarstwo rolne o powierzchni ogólnej 14,74 ha o przychodowości rocznej 26.550 zł. Z inwentarza żywego hoduje konia, 4 krowy (mleko nosi do miejscowego punktu skupu), 2 sztuki trzody chlewnej, 2 owce oraz drób. Posiada własne narzędzia rolnicze jak kosiarkę konną, snopowiązałkę konną, bronę, pług i inne niezbędne narzędzia w uprawie gospodarstwa rolnego. W chwili obecnej ubiega się o kupno wieloczynnościowej maszyny rolniczej, która przewraca i zgrabia siano. Korzysta również z pomocy miejscowego Kółka Rolniczego za odpłatnością w uprawie swoich gruntów. Zabudowania gospodarcze jak też dom mieszkalny są w stanie dobrym. Rodzina wymienionej składa się z 4 osób (w tym dwoje dzieci — jedno uczęszcza do szkoły podstawowej, drugie — w wieku przedszkolnym). W chwili obecnej z petentką zamieszkuje jej siostra, Maria Kuzyka, która otrzymuje rentę w wysokości 1220 zł. i zajmuje się opieką dzieci podczas pracy w polu petentki. Stosunki w rodzinie petentki są dobre. Tut. Wydział zwrócił się do Urzędu Gminy w Czyżach o zastosowanie ulgi w podatku gruntowym. Innej formy pomocy nie jesteśmy w stanie udzielić.

Nadmieniamy, że o sposobie załatwienia powyższych spraw powiadomiliśmy zainteresowanych oddzielnym pismem.

Z upoważnienia Kierownika Wydziału Zdrowia — podpis nieczytelny.



Ніна Матысюк, Беларускі ліцэй у Гайнаўцы. Вершы добрыя — мова багатая, цікавыя параўнанні і падтэксты. Адзін надрукуем у бліжэйшы час.

Галіна Давідзюк, Мастаўляны, Беластоцкі павет. Гумар добры, але для вуснага пераказу. Да друку не падыходзіць. А вы паспрабуйце пісаць інфармацыі пра вёску, як жывуць, якія цікавых, працавітых людзей. Здаецца нам, што добра ў вас гэта будзе выходзіць.

Дамініка Івацік, Ахрымы, Гайнаўскі павет. Рускія песні нам не падыходзяць, а фальклорныя мясцовыя, такія як „Песня-жарт", ці „Жніўная" — як найбольш. Мы іх перадалі рэдактару Гайдуку, які запісвае і апрацоўвае мясцовы беларускі фальклор. Мабыць да вас калі завітае.

Васіль Асенік, Спічкі. Здымкі, фактычна, да газеты не падыходзяць. Апавяданні будзем друкаваць у „Парнасіку".

М. Матвеюк. „Півавараў" надрукуем у чарзе. Артыкул пра Качалы таксама дамо.

КІНО

ГАЙНАЎСКІ ПАВЕТ

Белавежа

„Biały ptak z czarnym znamieniem" (radz.), 28—29. „Początek nowego świata" (rumuński), 30—31.

Чаромуха

„Umrzeć z miłości" (franc.), 28—29.

Кляшчэлі

„Oskarżeni o zabójstwo" (radz.), 28—29. „Dziewczyna na rozdrożu" (bułg.), 30—31. „Grubasek" (czeski), 1—2.IX.

Нарва

„Małżeństwo" (fran.), „Najlepsza kobieta mojego życia" (czeski), 29.VIII—2.IX.

Чыжы

„Śmierć na zakręcie" (NRD), 29.VIII—2.IX.

Дубічы Царкоўныя

„Okruchy życia" (franc.), „Wydra pana Grahama" (angl.), 29.VIII—2.IX.

Арэшкава

„Dziewczyna inna niż wszystkie" (angl.), „Hełm Aleksandra Macedońskiego" (radz.), 1—2.IX.

БЕЛЬСКІ ПАВЕТ

Орля

„Ktoś za drzwiami" (franc.), „Tajemnica Aleksandra Dumasa" (czeski), 29.VIII—2.IX.

Райск

„Szczęście Anny" (radz.), „Czarodziej Fablo" (franc.), 29.VIII—2.IX.

БЕЛАСТОЦКІ ПАВЕТ

Гарадок

„Ostatni wojownik" (USA), 1—2.IX.

Міхалова

„Błękitny ognik" (franc.), 28—29. „Harem pana Yoka" (CSRS), 30—31.

САКОЛЬСКІ ПАВЕТ

Шудзялава

„Hełm Aleksandra Macedońskiego" (franc.), „Rewizja osobista" (polski), 29.VIII—2.IX.

СЯМЯЦІЦКІ ПАВЕТ

Нурэц

„Włoch w Argentynie" (włoski), 28—29. „Miasto nieujarzmione" (polski) 30—31. „Sacco Vanzetti" (włoski), 1—2.IX.

Мельнік

„Spotkałem nawet szczęśliwych cyganów" (jugosł.), 28—29. „Wynajęty człowiek" (USA), 30—31. „Naszyjnik dla mojej ukochanej" 1—2.IX.

Ніва

Organ Zarządu Głównego Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego. Wydawca: Białostockie Wydawnictwo Prasowe RSW „Prasa-Książka-Ruch". Redaguje Kolegium. Adres Redakcji: Białystok, ul. Wesołowskiego 1. Numer przy przesyłkach pocztowych: Redakcja tygodnika „Niwa", Skr. poczt. 281, 15-950 Białystok. Telefony: Redaktor Naczelny i Sekretarz Redakcji 2-10-33, publicyści 2-32-41 do 45 (centrala). Cena prenumeraty krajowej: rocznie: 28,80 zł, półrocznie: 14,40 zł, kwartalnie: 7,20 zł. Prenumeraty przyjmowane są do dnia 10 każdego miesiąca poprzedzającego okres prenumeraty. Prenumeraty na kraj dla czytelników indywidualnych przyjmują Urzędy Pocztowe oraz listonosze. Można również wpłaty na prenumeratę indywidualną dokonywać na konto I Oddziału Rejonowego „Ruch" w Białymstoku 150-6-161 NBP I OM Białystok. Na odwrocie blankietu należy podać okres prenumeraty i tytuł zamawianego pisma. Wszystkie instytucje państwowe i społeczne w miastach, zamawiają prenumeratę wyłącznie za pośrednictwem Oddziałów i Delegatur RSW „Prasa-Książka-Ruch". Pozostałe — mające siedzibę na wsi lub w innych miejscowościach, w których nie ma Oddziałów i Delegatur zamawiają prenumeratę za pośrednictwem Urzędów Pocztowych. Prenumeratę na zagranicę przyjmuje: RSW „Prasa-Książka-Ruch", Biuro Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych, Wronia 23, 00-840 Warszawa. Konto PKO Nr 1-6-100024. Cena prenumeraty dla zagranicy jest wyższa od prenumeraty krajowej o 40 proc. Nr indeksu 36911

BZGraf. Nakład

ДОБРЫ НАСТРОЙ

Галоўбух Іван Іванавіч сядзеў за сваім столікам ля акна, ляніва пазяхаў, прыкрываючы рукою рот, і пазіраў на вуліцу. Раптам ён абыякава прагаварыў:

— Мядзведзь...

Намеснік галоўбуха Іван Нічыпаравіч ад нечаканасці выпусціў з рук шарыкавую ручку.

— Што? Дзе?

— Мядзведзь, гавару, — тым жа тонам паўтарыў Іван Іванавіч, глядзячы кудысьці ўгору.

— Які мядзведзь?

— Белы, — пачуўся адказ.

— Дзе? — нічога не разумеючы, Іван Нічыпаравіч падазрона зірнуў на Івана Іванавіча: ці мала што можа здарыцца з чалавекам ад лодарнічання?

— Воблачка, кажу, на мядзведзя падобнае, — растлумачыў Іван Іванавіч.

— Ах, воблачка! — абрадаваўся Іван Нічыпаравіч і зазірнуў у акно.

І сапраўды: па небе плыло адзінокае воблачка, толькі...

— Ну хіба ж гэта на мядзведзя падобна, Іван Іванавіч? Гэта ж сапраўдны леў! Вунь і грыва нават.

— Ты што,Нічыпаравіч, мядзведзя ад льва не адрозніш?

— Іван Іванавіч... — пачаў Іван Нічыпаравіч. Але тут у бухгалтэрыю зайшоў эканаміст Іван Васільевіч.

— А ну давай сюды! — махнуў рукой Іван Іванавіч.

А калі той падышоў, галоўбух тыцнуў пальцам у шыбіну і сказаў:

— Скажы ты Івану Нічыпаравічу, што гэта за звер па небе паўзе.

Іван Васільевіч доўга ўглядаўся ў неба, потым, мабыць, зразумеў у чым справа і выпаліў:

— Самы сапраўдны парсюк!

Іван Іванавіч ікнуў ад нечаканасці:

— Сам ты...

— А хто ж па-вашаму? — спытаў эканаміст.

— Мядзведзь! — сказаў Іван Іванавіч.

— Леў! — сказаў Іван Нічыпаравіч.

— Ну... — разгублена працягнуў Іван Васільевіч і выслізнуў за дзверы.

Мінуты праз тры дзверы зноў адчыніліся і ў кабінет увайшоў дырэктар Іван Кузьміч. Ён паглядзеў на ўсмешлівыя твары сваіх супрацоўнікаў.

— Што тут у вас? — сурова спытаў Іван Кузьміч. — Добры настрой! — І, не чакаючы адказу, накіраваўся да акна, глянуў на воблачка.

— Бегемот! — цвёрда адрэзаў ён, быццам грукнуў пячаткай.

А. Аўрамчык

ПАЗНАЛА

Бацька паказвае Марыйцы літары.

— Глядзі, дачуся, уважліва ды запамінай. Вось гэта літара „А", гэта кругленькая — „О", а гэта — „Я".

Праз некалькі дзён Марыйка ў буквары знаходзіць знаёмае „Я" і радасна пляскае ў ладоні:

— Мама, глянь — вось наш татка!

НЕ ДАЛІЛА

Вярнуўся Валодзя з малочнай крамы:

— Мама, прадаўшчыца сёння не даліла сьмятаны.

Адкуль ты ведаеш? — пытае мама.

— Бо я сёння не мог языком дастаць да смятаны ў слоіку.

НІЎКА

Ды не спяшы ты! Яшчэ і лётчык жа не прыйшоў!

ЗВЫЧАЙНЫМ ШЛЯХАМ

Суддзя пытаецца ў падсуднага:

— Прызнаеце вы сябе вінаватым у кражы цыстэрны спірту?

— Прызнаю.

— Што вы зрабілі з гэтым спіртам?

— Прадаў.

— А што вы зрабілі з грашыма?

— Прапіў.

НЕ ТОЙ ТЭМП

— Пара пакончыць з гэтымі ідыёцкімі расходамі.

— Дарагі мой, я не трачу больш, чым ты зарабляеш, я проста хутчэй трачу.

МІНІБАЙКІ

СВАБОДНАЯ ДЫСКУСІЯ

Барбос пачуў лісіны брэх, усунуў нос у куратнік і спытаў:

— Што тут дзеецца?

— Свабодная дыскусія, — адказала Ліса, — я спрачаюся з Пеўнем.

— Дзіўная дыскусія, — здзіўляецца Барбос, — спрачаешся адна ты, а твой апанент ляжыць і маўчыць.

— Нармальная з'ява, — вытлумачыла Ліса, — Пеўню, каб спрачацца са мною, трэба мець галаву на плячах.

М. Азаў, У. Цхвінскі

— Эй, вазьміце мяне назад. Я баюся падаць!!

...Ён глядзеў субяседніку ў вочы... узяўшы яго за горла.

...Ён не любіў падхалімаў. Яны нагадвалі яму яго мінулае.

УПЕРШЫНЮ

Жнівень. Сонца бязлітасна паліць дарогу. Селянін, яго конь і возік з цяжкасцю карабкаюцца пад гару. Урэшце, ускарабкаўшыся на гару, селянін выцірае пот і кажа:

— Вось чорт вазьмі! Ніколі ў жыцці не бачыў такой гарачыні, як гэтая!

— І я таксама, — сказаў конь.

— Што? — уздрыгнуў селянін. — Першы раз у жыцці чую, каб конь гаварыў.

— І я таксама, — сказаў возік.

НЕШЧАСЛІВЫ ВЫПАДАК

Перапалоханы хлапец выбег з гаража.

— Мама, мама, а нашага тата электрыка мала не забіла!

— Як? — збялела маці.

— Акумулятар на галаву ўпаў.

— Як прыемна пачытаць цікавую кнігу ў адзіноцтве!

ЖАХЛІВАЯ ПАМЫЛКА

— Хэло, дружа, я чуў, што ты пасварыўся з мільянеркаю, якая мела намер выйсці за цябе замуж! З глузду з'ехаў ці што?

— Так, гэта праўда. І вінаваты ў гэтым толькі я.

— Што ж ты зрабіў?

— Аднойчы я ёй сказаў, што ў яе зморшчаныя панчохі.

— Ну дык і што?

— А яна была без панчох...

ВЫГАДНЕЙ

Малады габравец хацеў вучыцца на ўрачатэрапеўта

— Дурань! — лаяў яго бацька. — Будзь зубным урачом. У людзей адно сэрца, затое 32 зубы!

МІНІВЕРШЫ

ВЫПІВОХА НА ПАХМЕЛЦЫ

Дужыя перавяліся:
Век жыві і век лячыся.

ПАДВЯЛА МОДА

Дзяўчыну я спытаў нясмела:
Дзе зараз прыгажосць,
Чаму за дзень так пасівела?
— Была ў цырульні ўчора я!

Мікола Вяршынін

ГУМАР З

І БЕЗ ТАГО ВІДНА

— Ведаеш, кум, што мне месяц больш падабаецца, як сонца. Як ідзе чалавек з карчмы дадому, то месяц свеціць — і дадому зойдзеш, а сонца што дапамагае? Яно днём свеціць, а днём і без таго відна.

ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

Па просьбе Алі Чэшаль з Меляшкоў Беластоцкага павету змяшчаем песню з рэпертуару М. Магамаева

SERCE NA ŚNIEGU

Trojki dwie gonią się
leci w noc dzwoneczków głos
W pierwszych saniach jedziesz ty
a pochodnie sypią skry
co gonitwa ta
nam obojgu da

Ty moich sań śledzisz bieg
I rzucasz serce na śnieg
Żywy kwiat, żywy płomień.
Ja sercu ogrzać się dam
I nie będą już sam
Przyjdzie do mnie dobrze wiem
Trojki skończą swój bieg
Minie zima i śnieg
Wiosna świat zazieleni
Żyć bez serca tak źle
Dam ci swoje weź je
Już nie zmieni tego nikt.

Wokół nas biały śnieg
Niby stos czyściutkich kart
Ktoś napisze może wiersz
O przygodzie naszych serc
Gdy zasypie wiatr
Sań podwójny ślad

Ty moich sań śledzisz...

Без слоў.

ЯК ВАМ ЛЕПШ

— Афіцыянт, што вы мне падалі: каву ці суп?

— Гэта як вам будзе лепш: можаце лічыць, што суп, а можаце лічыць, што каву. Толькі я вам параіў бы думаць, што вы п'еце каву — гэта для вас абыдзецца танней.

КУРЁЗЫ

МАМА ЗА ПУЛЬТАМ

Гюнтэр Бельцыг, інжынер з Гамбурга, прывык да ўсяго падыходзіць грунтоўна. Таму, калі жонка катэгарычна заявіла яму, што не можа ўправіцца з трыма малалетнімі дзяцьмі без яго, бацькоўскай, дапамогі, ён рашыў пытанне радыкальна. А менавіта — сканструяваў агрэгат, выконваючы функцыі няньці. Цяпер націскам кнопкі можна было ўключыць баюкаючую канструкцыю, націскам іншай кнопкі — запіс калыханкі ў добрым выкананні. Калі прамокла пялёнка, на табло запальвалася чырвоная лямпачка. Славам, прылада набліжалася да дасканаласці, як лічыў Бельцыг. Адзіная акалічнасць: пакуль Гюнтэр будаваў і дасканаліў свой агрэгат, двое старэйшых дзяцей ужо пайшлі ў школу, а малодшая дачка наадрэз адмовілася лезці ў механізаваную калыску. З вялікай цяжкасцю яе ўдалося заманіць у агрэгат для фотаздымкі.

ПАКАРАННЕ... АМПУТАЦЫЯЙ

Нядаўна Лівія абвясціла, што ў некаторых выпадках крадзеж будзе карацца ампутацыяй кісці правай рукі і ступні левай нагі. Гэта аперацыя павінна будзе праводзіцца ў бальніцы хірургам.

МІЖ НАМІ

Не так ужо важна, адкуль дзьме вецер, важна, куды ён дзьме.